Жыхары спаленых вёсак, што засталіся ў жывых, афіцыйнага прызнання ахвярамі вайны не маюць, кампенсацыйных выплат не атрымліваюць. Нядаўна іх статус быў прызнаны берлінскім аб'яднаннем «Кантакты». СТАР 3

У Беларусі восенню мінулага года быў зацверджаны новы парадак атэстацыі педагагічных работнікаў, які падвергся жорсткай крытыцы з боку педагагічнай грамадскасці. СТАР 5

Усё большую колькасць беларусаў цікавіць сітуацыя ў Венесуэле. Сярод іх не толькі палітыкі, эксперты і журналісты, але і сваякі камандзіраваных у паўднёва-амерыканскую краіну спецыялістаў. СТАР 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 СТУДЗЕНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 12 (27377) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗНАЧНА ЗНІЖАНА НАГРУЗКА НА СУДДЗЯЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 студзеня правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Вярхоўнага суда Валянцінам Сукалам.

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў абмеркаваць найбольш значныя праблемы, якія сёння існуюць у судовай сферы. «У свой час мы прынялі радыкальнае рашэнне па развіцці нашай судовай сістэмы. Як вы цяпер ацэньваеце, у чым мы там недапрацавалі, магчыма, ёсць нейкія праблемы, якія трэба вырашыць? Чаго не хапае судам?» — пацікавіўся Прэзідэнт.

Аляксандру Лукашэнку было даложана аб ходзе рэалізацыі Паслання аб перспектывах развіцця сістэмы агульных судоў Беларусі, якое зацверджана ў кастрычніку 2011 года і стала важным этапам судова-прававой рэформы.

Паводле слоў Валянціна Сукалы, за мінулыя паўтара года гэта рэформа ў значнай частцы ўжо рэалізавана. З 54 даручэнняў, якія змяшчаліся ў Пасланні, выкананы 24. Астатнія знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі або разлічаны на больш працяглы перыяд аж да 2015 года. Ужо ёсць першыя пазітыўныя вынікі. Дзякуючы прынятым мерам удалося значна знізіць нагрузку на суддзяў, скараціць аб'ёмы крымінальнага, грамадзянскага і адміністрацыйнага правасуддзя. Гэта ў сваю чаргу дало магчымасць палепшыць якасць папярэдняга расследавання і разгляду спраў у судах.

ВІКТАР ШЭЙМАН НАЗНАЧАНЫ КІРАЎНІКОМ СПРАЎ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка назначыў Віктара Шэймана кіраўніком спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, вызваліўшы яго ад пасады памочніка Прэзідэнта Беларусі па асаблівых даручэннях.

У студзені 2013 года Віктар Шэйман быў назначаны памочнікам Прэзідэнта Беларусі па асаблівых даручэннях.

Шэйман Віктар Уладзіміравіч нарадзіўся ў 1958 годзе ў в.Салтанішкі Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыў Благавешчанскае вышэйшае танкавае вучылішча і Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. У 1975-1992 гадах служыў ва Узброеных Сілах на пасадах камандзіра, палітычнага, камандна-штабнога складаў, у тым ліку ў Рэспубліцы Афганістан.

Генерал-палкоўнік. Прафесар Акадэміі праблем бяспекі, абароны і правапарадку Расійскай Федэрацыі. Дзяржаўны саветнік юстыцыі 1-га класа.

Прэс-службa Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ХТО ПА ВАДУ, А ХТО — У ВАДУ

Палонка на Гайне ў Лагойску нагадвала гарадскі пляж у летнюю спёку. СТАР 3

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй САВІНЫХ, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў:

«У адпаведнасці з падпісаным у 1994 годзе ў Будапешце Мемарандумам аб гарантыях бяспекі ў сувязі з далучэннем Беларусі да Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі ЗША добраахвотна ўзялі на сябе дамоўленасці, якія юрыдычна іх абавязваюць: яны абавязаліся не выкарыстоўваць ні пры якіх абставінах меры эканамічнага прымусу ў дачыненні да Беларусі. Тым не менш, ЗША гэтыя свае юрыдычныя абавязацельствы фактычна парушылі. Гэта сур'ёзнае парушэнне, якое падрывае аўтарытэт саміх ЗША. Дарэчы, у тых сферах, дзе мы адыходзім ад палітычных клішэ, дыялог паміж дзвюма нашымі краінамі выстройваецца досыць роўна».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 7°
Віцебск	– 14°
Гомель	– 8°
Гродна	– 9°
Магілёў	– 12°
Мінск	– 12°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.01.2013 г.

Долар ЗША	8610,00	▼
Еўра	11470,00	▲
Рас. руб.	284,00	■
Укр. грыўня	1059,69	▼

НОВЫ БЮДЖЭТ — СПРОБА НОВАГА ФІНАНСАВАННЯ АДУКАЦЫІ, АХОВЫ ЗДАРОЎЯ І НАВУКІ

Пачаўся новы год. Час падводзіць вынікі года мінулага. Для эканомікі ён быў складаным і жорсткім ва ўсіх сэнсах. Не такім, вядома, як 2011-ы, але тым не менш. Міністэрствы фінансаў і эканомікі сцвярджаюць, што 2012 год мы пражылі годна. Ёсць недахопы, але і пераваг нямала.

ВУП І ІНШЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

Аляксандр Ярашэнка, намеснік міністра эканомікі Беларусі, заявіў журналістам, што прырост ВУП склаў 1,5%. «Асноўны ўплыў на эканамічны рост краіны аказала прамысловасць (1,8% у росце ВУП). Значны ўклад быў з боку сельскай гаспадаркі — 0,5%», — агучыў некаторыя лічбы намеснік міністра. Пры гэтым практычна на працягу ўсяго мінулага года назіралася падзенне аптовага гандлю — больш за 40%. «Гэта значна паўплывала на ВУП». Але купля насельніцтвам нехарчовых груп тавараў вырасла (117,5% у адносінах да харчовых). А значыць у нас, па словах Аляксандра Ярашэнкі, аднаўляецца плацежаздольны попыт насельніцтва.

Вымушаная жорсткая грашова-крэдытная палітыка стрымлівала інвестыцыйную дзейнасць. Акрамя таго, «у нас прэвалююць так званыя «інвестыцыі ў цэглу» (49%). І для нас задача ў тым, каб перамяніць сітуацыю: каб інвестыцыі ішлі ў тэхналагічнае абнаўленне, абсталяванне, каб яны перавышалі інвестыцыі ў будаўнічыя работы». Сальда ж знешняга гандлю склалася за 11 месяцаў 2012 года дадатным — 3,3 млрд долараў. Яшчэ адзін станоўчы момант — «хоць і не без цяжкасцяў мы вытрымалі індэкс спажывецкіх цэн (інфляцыю. — **Аўт.**) у межах прагнозных велічынь. Было не перавышэнне 22% — маем 21,8%». Прырост даходаў насельніцтва за 11 месяцаў 2012 года склаў 20,6%. «Гэта дастаткова добрыя паказчыкі, — лічыць намеснік міністра. — Але такая важная прапорцыя паміж прадукцыйнасцю працы і зарплатамі была ўсё ж такі парушана».

БЮДЖЭТ З ПРАФІЦЫТАМ

Максім Ермаловіч, намеснік міністра фінансаў Беларусі, паведаміў, што запланаваны бездэфіцытным бюджэт 2012 года ў выніку аказаўся нават з невялікім прафіцытам — у памеры 2,8 трлн рублёў. Пры гэтым у поўным аб'ёме выкананы ўсе абавязацельствы па дзяржаўным доўгу. «На расходы бюджэту аказалі ўплыў некалькі фактараў, — расказаў намеснік міністра. — Па-першае, дадатковыя выдаткі на выплату заработнай платы. Па-другое, уплыў на мясцовыя бюджэты стрымлівання павышэння тарыфаў на паслугі ЖКГ і транспарту. У выніку трэба было павялічваць расходы бюджэту па гэтых артыкулах. Па-трэцяе, мы сутыкнуліся з неабходнасцю павелічэння расходаў і на фінансаванне дзяржаўных і мясцовых інвестыцыйных праграм: кошт будаўніцтва рос большымі тэмпамі, чым мы чакалі. Таксама дадатковым артыкулам расходаў стала субсідаванне працэнтных ставак па крэдытах для эканомікі. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што ў межах выканання асноўных параметраў грашова-крэдытнай палітыкі мы вымушана трымалі высокі ўзровень стаўкі рэфінансавання, а гэта паўплывала на рост субсідавання па раней выдадзеных крэдытах для інвестыцыйных праектаў». СТАР 2

Анатоль ТОЗІК:

«СІСТЭМА БАЦЬКОЎСКАЙ АПЛАТЫ ЗА ДЗІЦЯЧЫ САДОК ПАВІННА БЫЦЬ ЗМЕНЕНА»

«У бліжэйшы час нам трэба будзе вырашыць дзве асноўныя задачы — забяспечыць годную заработную плату педагогам у дзіцячых садках і на 100% задаволіць патрэбы сем'яў у паслугах устаноў дашкольнай адукацыі», — заявіў на выязной калегіі Міністэрства адукацыі ў Магілёве намеснік прэм'ер-міністра беларускага ўрада Анатоль ТОЗІК. Тэмай пасяджэння стала выкананне «Праграмы развіцця сістэмы дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь на 2009—2014 гады».

На калегіі былі агучаны шэраг фактаў і лічбаў, якія прымушаюць сур'ёзна задумацца. Сёння ў краіне функцыянуюць 4070 дашкольных устаноў, але з іх толькі 9 устаноў прыватнай формы ўласнасці (7 — у Мінску і па адной — у Магілёве і Мінскай вобласці). У чарзе на прадастаўленне месца ў дзіцячым садку сёння стаяць амаль 8,3 тысячы дзяцей дашкольнага ўзросту — гэта дзеці, якім не змаглі на момант звароту прадаставіць месца ў дзіцячым садку па месцы жыхарства сям'і. Хоць увогуле па краіне колькасць месцаў у дашкольных установах перавышае колькасць дзяцей дашкольнага ўзросту. Праблема ў забеспячэнні ўстаноў дашкольнай адукацыі крокавай даступнасці актуальная для 28 мікрараёнаў-новабудоўляў. Абмежаванасць бюджэтных сродкаў не дазваляе захоўваць нормы будаўніцтва ўстаноў дашкольнай адукацыі ў гэтых мікрараёнах: жылыя дамы там уводзяцца, а вось з'яўлення дзіцячага садка сем'ям даводзіцца яшчэ доўга чакаць. Больш як 500 дашкольных устаноў вымушаны працаваць з перагрузкай: пераўкамплектаванасць груп дзецьмі складае ад 20 да 40 працэнтаў.

Высокім застаецца паказчык па колькасці траўмаў, атрыманых дзецьмі ў дашкольных установах: у 2012 годзе было зарэгістравана 49 такіх выпадкаў. Грашовыя нормы на харчаванне дзяцей адстаюць ад натуральных: натуральныя нормы выконваюцца ў сярэднім толькі на 85,4 працэнта.

Аснашчэнне ўстаноў дашкольнай адукацыі сродкамі навучання, гульнявым і фізкультурным абсталяваннем складае ў сярэднім па краіне толькі 68% ад устаноўленых нарматываў.

— Але згаданы ў справаздачы працэнт аснашчанасці не адлюстроўвае рэальную карціну, — сцвярджае **начальнік упраўлення дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Галіна МАКАРАНКАВА**. — Большасць устаноў дашкольнай адукацыі не маюць аснашчэння, якое б адпавядала сучасным патрабаванням адукацыйнага працэсу — больш як 50% гэтых сродкаў знаходзяцца ў доўгатэрміновым выкарыстанні, зношаны ці састарэлі. Нярэдка адсутнасць элементарных цацак, фізкультурнага інвентару і іншых сродкаў навучання ператварае дзейнасць дзіцячага садка толькі ў форму догляду дзяцей, што загадзя з'яўляецца эканамічна немэтазгодным.

Нізкі сацыяльны статус дашкольных работнікаў, які захоўваецца на працягу многіх гадоў, прыводзіць да адтоку кваліфікаваных кадраў. Упершыню за апошнія 10 гадоў колькасць вакансій педагагічных работнікаў дасягнула 2808 штатных адзінак. 42% педагогаў, якія працуюць у дашкольных установах, не маюць педагагічнай адукацыі дашкольнага профілю. СТАР 2

■ Завочная прамая лінія

ПЕРАЛОМУ МОЖНА ПАЗБЕГНУЦЬ

Ці можна выявіць астэапароз на ранніх этапах? З якога моманту неабходна задумвацца аб даследаванні мінеральнай шчыльнасці коснай тканкі? Як засцерагчыся пералому, калі косці ўжо ломкія? На гэтыя і іншыя вашы пытанні, шаноўныя чытачы, адкажа **прафесар, доктар медыцынскіх навук, кіраўнік Мінскага гарадскога цэнтра прафілактыкі астэапарозу Эма Уладзіміраўна РУДЭНКА**.

Пытанні пакідайце, калі ласка, па рэдакцыйным нумары **8 (017) 287 18 29 да 28 студзеня**. Адказы будуць надрукаваны на старонках газеты «Звязда».

НАПРЫКАНЦЫ ТЫДНЯ — МАРАЗЫ ДА МІНУС 27

Сёння ў паўночнай палове краіны спакойнае надвор'е будзе вызначацца зонай павышанага атмасфернага ціску, аднак у паўднёвых раёнах пачнуць гаспадарыць актыўныя франтальныя раздзелы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму ў аўторак па поўдні Беларусі пройдзе снег, слабая мяцеліца, у асобных раёнах мокры снег, галалёд і наліпанне мокрага снегу. Месцамі па Брэсцкай і Гомельскай абласцях прагназуюцца моцныя снегапады. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра мінус 9—14, а ў паўднёвых раёнах — 6—8 марозу.

У сераду і чацвер атмасферны ціск будзе далей павялічвацца і ападкаў амаль не чакаецца, толькі на поўдні Беларусі яшчэ магчымы кароткачасовы снег. Аднак сур'ёзна пахаладае. Уначы на 23 і 24 студзеня маразы ўзмоцняцца да мінус 13—20, а пры праясненнях — нават да 25 градусаў ніжэй за нуль. Удзень прагназуецца мінус 7—14, месцамі — да 16 марозу. Паводле папярэдніх прагнозаў, бліжэй да выхадных маразы будуць яшчэ мацнець. У пятніцу—нядзелю ўначы будзе мінус 15—22, пры праясненнях — да 23—27 марозу. Удзень у гэтыя дні — мінус 8—13, месцамі — 14—17 марозу. У асобных раёнах магчымы невялікі снег.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У БЛІЖЭЙШЫЯ 20 ГАДОЎ ЖЫХАРАМ ЗЯМЛІ СПАТРЭБІЦЦА НА 50% БОЛЬШ ХАРЧАВАННЯ

У бліжэйшыя 20 гадоў жыхарам Зямлі спатрэбіцца на 50% больш харчавання, на 45% больш электраэнергіі і на 30% больш пітной вады. Пра гэта заявіў генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун, выступаючы перад студэнтамі і прафесарамі Стэнфардскага ўніверсітэта. Пан Гі Мун засяродзіў увагу на цяперашнім этапе развіцця чалавецтва. Кіраўнік ААН назваў яго «вялікім пераходным перыядам». На думку генеральнага сакратара, свет перажывае перш за ўсё эканамічны пераходны перыяд, паколькі лакаматывам сацыяльна-эканамічнага развіцця пачынае станавіцца Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён. Акрамя таго, чалавецтва ўшчыльную сутыкнулася з крызісам у сваёй эвалюцыі, бо без укаранення прынцыпаў устойлівага развіцця планеце Зямля пагражае небяспека.

АЎСТРЫЙЦЫ ПАДТРЫМАЛІ ЎСЕАГУЛЬНУЮ ВАЙСКОВУЮ ПАВІННАСЦЬ



Большасць аўстрыйскіх выбаршчыкаў прагаласавалі 20 студзеня за захаванне ўсеагульнай вайсковай павіннасці ў краіне. Рэферэндум быў закліканы вырашыць, захоўваць цяперашнюю сістэму ўсеагульнай вайсковай павіннасці ці перайсці на прафесійную армію. За абавязковую службу выказаліся 59,8 працэнта ўдзельнікаў рэферэндуму пры яўцы 50 працэнтаў. Пры гэтым з дзевяці аўстрыйскіх зямель прафесійную армію падтрымала толькі Вена. На думку прыхільнікаў дзейнай сістэмы, прафесійнае войска абыдзецца краіне занадта дорага пры агульнай тэндэнцыі на скарачэнне выдаткаў у Еўразоне. Аўстрыя з'яўляецца адной з нешматлікіх еўрапейскіх краін (разам з Даніяй, Грэцыяй, Нарвегіяй, Фінляндыяй і Швейцарыяй), дзе захавалася абавязковая служба па прызыве.

СПІРТНОЕ ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ПРАБЛЕМ У ІНТЫМНЫМ ЖЫЦЦІ

Калі мужчына злоўжываў алкаголем, то яшчэ на працягу года і больш пасля адмовы ад згубнай звычкі ён можа сутыкацца з праблемамі ў інтымным жыцці, піша The Telegraph. Гэта даказала апытанне, якое праводзілася навукоўцамі з Універсітэта Святога Томаса і Універсітэта Гранады. Вердыкт адназначны: спіртное выклікае так званую праходзячую эрэктыльную дысфункцыю. Як паведамляецца ў справаздачы ў часопісе Journal of Sexual Medicine, такі від дысфункцыі нельга вызначыць як часовы. Усё ж такі праблемы заставаліся на працягу года, і сітуацыя не палепшылася нават пасля адмовы ад спіртнога. Больш за тое, навукоўцы ўстанавілі, што людзі, якія злоўжываюць спіртным, атрымліваюць менш задавальнення ад сэксу ў параўнанні з тымі, каму ўдавалася прытрымлівацца прынцыпу ўмеранасці.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

УСТУПЛЕННЕ МАЛДОВЫ Ў ЕС ПАДТРЫМЛІВАЮЦЬ 52% ГРАМАДЗЯН, У МС — 48%

Большасць грамадзян Малдовы выступаюць за ўступленне рэспублікі ў Еўрапейскі саюз. Пра гэта сведчаць зместкі сацыялагічнага даследавання, праведзенага Асацыяцыяй сацыёлагаў і дэмографаў Малдовы.

Як паведаміў віцэ-старшыня асацыяцыі Мікалай Бадзян, згодна з вынікамі апытання, у выпадку правядзення рэферэндуму аб далучэнні Малдовы да Еўрасаюза 52% грамадзян рэспублікі выказаліся б «за», 29% — «супраць», а 7% не прынялі б ўдзелу ў галасаванні. У той жа час за ўступленне Малдовы ў Мытны саюз выступілі б 48% грамадзян. «Супраць» выказаліся б 25% рэспандэнтаў, а 6% не прынялі б у ім удзелу. 21% апытаных не змаглі даць дакладны адказ на гэтае пытанне.

Калі б прайшоў рэферэндум па ўступленні Малдовы ў НАТА, то больш за палову грамадзян рэспублікі прагаласавалі б супраць. За ўступленне ў Паўночнаатлантычны альянс прагаласавалі б 19%. Прыкладна 25% рэспандэнтаў не бачаць неабходнасці ўступлення Малдовы ў названы ваенны блок, а 5% наогул нічога не ведаюць пра НАТА.

ЯК ЗРАБІЦЬ СВАЮ КВАТЭРУ «ЭКАНОМНАЙ»?

Віктар НІКАЛАЙЧЫК, генеральны дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Гроднааблпаліва»:

— У сэнсе эканоміі вады і газу ў нашай кватэры дапамагаюць лічыльнікі. Што тычыцца электрычнасці, цяпла і іншага, заўважу — навукова-тэхнічны прагрэс набірае такія каласальныя абароты, што звышэканамічныя лямпачкі, тэлевізары, іншая электроніка і бытавая тэхніка, якія яшчэ некалькі гадоў таму былі на перадавых пазіцыях, сёння ўжо на парадак, а то і ў разы саступаюць лідарства новым тэхналогіям і вынаходкам. Справа за нямногім: быць у курсе ўсяго новага, перадавога, падлічыць усе «за» і «супраць» і прыняць найбольш рацыянальнае для сям'і рашэнне — што і ў якія тэрміны абнаўляць у залежнасці ад сваіх магчымасцяў і запатрабаванняў. Не шкодзяць эксперыменты: напрыклад, аддаць перавагу электрачайніку ці звычайнаму, што свішча на газе. У год беражлівасці асабліва актуальным лічу беражлівыя і клапатлівыя адносіны да родных людзей, якія сумесна пражываюць. Менавіта ўзаемаразуменне і падтрымка адзін аднаго дазваляюць захаваць не толькі посуд ад разбівання, але і нервовыя клеткі.



Уладзімір ЛОГАШ, інжынер-будаўнік, г. Гродна:

— У беларусаў здаўна ёсць мудрасць, што сапраўдны гаспадар — гэта той, хто выйшаў з хаты, ідзе па падворку і знаходзіць рубель. Варочаецца назад — знаходзіць два рублі! У мінулым стагоддзі амерыканскі вучоны славянскага паходжання Цярэшчанка распрацаваў тэму аб «эфекце дробязяў». З імі ў штодзённым побыце мы сустракаемся пастаянна: то кран падцякае, то змыўны бачок у прыбіральні не трымае ваду, то лямпачка надта ярка гарыць... Напрыклад, я паступова з кожнай пенсіі, якая, дарэчы, сціплая, купляю энергаэфектыўныя лямпачкі на замену звычайным. А ў летні перыяд на сваім дачным участку атрымліваю 4-5 літраў гарачай вады дзякуючы 15-метроваму шлангу, які каля дзвюх гадзін ляжыць на сонцы. Гэтага хапае перамыць посуд і на іншыя патрэбы. І яшчэ. З ранняй вясны пачынаецца буйны рост пустазелля. Вакол дачы, у лесе, на беразе Нёмана з'яўляюцца крапіва, макрыца, дзьмухавец, скрыпень, стрэлкі ... Усе гэтыя расліны — крыніца вітамінаў, мікраэлементаў, іншых карысных рэчываў, гэта цудоўныя дабаўкі ў супы і салаты.

Ірына ЧАРНОВА, пенсіянерка, г. Ваўкавыск:

— Заняткі ў Школе энергазберажэння, якія былі арганізаваны Тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ваўкавыскага раёна для людзей пенсійнага ўзросту, дазволілі мне змяніць стаўленне да вядзення хатняй гаспадаркі і ўліку сямейнага бюджэту. Каб зрабіць сваю кватэру «эканомнай», а вядзенне гаспадаркі эфектыўным, я правяла хатні энергааўдыт. Улік спажывання рэсурсаў выявіў нерацыянальнае выкарыстанне сямейнага бюджэту. Зрабілі адпаведныя высновы, і цяпер наша сям'я жыве па простых, але разумных правілах. Выключаем святло ў пакоях пры выхадзе з іх, эканомна выкарыстоўваем ваду пры мыцці, радзей карыстаемся мікрахвалевай печчу для разагравання ежы, уцяплілі вокны і дзверы, часткова замянілі старую бытавую тэхніку. А яшчэ мы вырашылі зрабіць рамонт па правілах «карыснага» дызайну. Лічу, што комплексныя меры эканоміі ў побыце — гэта не толькі ў інтарэсах сямейнага бюджэту, але і крок да гармоніі ў душы і жыццеўладкаванні.

Падрыхтаваў Барыс ПРАКОПЧЫК.

НОВЫ БЮДЖЭТ...

ТЫЯ Ж НАДЗЕІ

«У 2013 годзе мы збіраемся захаваць узважаную палітыку выканання бюджэту. Ён, як і летась, зацверджаны бездэфіцытным. Але ёсць навацыі», — паведаміў Максім Ермаловіч. Будуць рэалізоўвацца пілотныя праекты па фінансаванні адукацыі, аховы здароўя і навукі. «У адукацыі мы збіраемся перайсці на нарматыўнае фінансаванне ўстаноў адукацыі. Там будуць усталёўвацца формулы разліку нарматываў гадавога фінансавання навучання аднаго вучня ў разліку на год. Гэта прадугледжвае ўвязку фактычна аказанай паслугі бюджэтнай арганізацыі з аб'ёмам яе фінансавання. Колькі вучняў навучана, як аптымізаваны штат супрацоўнікаў, як забяспечаць нарматыўную напаўняльнасць класаў — такі аб'ём фінансавання і будуць атрымліваць. Пілотны праект, які датычыцца ўстаноў аховы здароўя, будзе ажыццяўляцца ў двух кірунках. Па-першае, увязка аб'ёмаў фінансавання асобных арганізацый аховы здароўя і ўзроўню аплаты працы (асабліва яго) з якасцю бюджэтных паслуг. А значыць, зарплата ўрача будзе залежаць ад паказчыкаў яго дзейнасці, каб зрабіць так: чым лепш урач робіць сваю работу, тым больш ён атрымлівае. Па-другое, будзе ўхіл у бок фінансавання амбулаторна-паліклінічнай службы (каля 40% ад усяго фінансавання). Наконт навукі: падрыхтаваны праект пастановы Савета Міністраў, якая будзе прадугледжваць базавае фінансаванне навуковых устаноў, гэта значыць аплату дзейнасці абмежаванай колькасці супрацоўнікаў навуковых арганізацый па выкананні фундаментальных і асобных прыкладных даследаванняў. Іншымі словамі, асобным установам будуць даваць гранты для пэўнага навуковага даследавання».

МАДЭРНІЗАЦЫЯ

«Звяртаюся да кіраўнікоў прадпрыемстваў: атрымаць грошы з бюджэту — гэта самае простае, але бюджэт будзе аказваць падтрымку толькі ў субсідаванні працэнтных ставак па крэдытах. Астатнія рэсурсы на мадэрнізацыю шукайце самі», — заявіў Максім Ермаловіч.

ЗНЕШНІ ДОЎГ

Усяго для пагашэння знешняга доўгу ў 2013 годзе Беларусі патрэбна 3 млрд долараў ЗША. 2,3 млрд — пагашэнне асноўнага доўгу. 0,7 млрд — выплата працэнтаў. «Гэтыя 700 млн прадугледжаны ў бюджэце. Астатняе будзе складацца з прыцягненых праз дзяржаблігацыі для фізічных і юрыдычных асоб сродкаў (ужо зараз гэта больш за 300 млн долараў), 1,3 млрд долараў ад Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, а таксама рэзерваў бюджэту і сродкаў, прыцягненых еўрабондамі. Таму ніякай вялікай пагрозы мы тут не бачым», — упэўнены намеснік міністра фінансаў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«СІСТЭМА БАЦЬКОЎСКАЙ АПЛАТЫ ЗА ДЗІЦЯЧЫ САДОК ПАВІННА БЫЦЬ ЗМЕНЕНА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Няведанне выхавальнікамі спецыфікі дашкольнага ўзросту прыводзіць да шэрагу праблем: у педагагічнай дзейнасці пераважае вучэбна-дысцыплінарная мадэль, педагогі спрабуюць трансляваць на работу з маленькімі дзецьмі школьныя методыкі выкладання, не ўлічваюць індывідуальныя асаблівасці дзяцей, дапускаюць перавышэнне вучэбнай нагрузкі, — тлумачыць Галіна Макаранкава. — Бацькі не могуць не заўважаць эмацыйных перагрузак, таму часта паміж бацькамі і педагогамі ўзнікаюць напружанасць і недавер, што таксама адбіваецца на эмацыйным стане дзяцей і на якасці іх адукацыі. Між іншым некаторыя здольнасці, не заўважаныя ў дашкольным узросце, пазней ужо праблематычна будзе развіць. Вышэйшую адукацыю сёння маюць 55,4% педагогаў дашкольных устаноў .

«А ці сапраўды так патрэбна выхавальнікам дашкольных устаноў вышэйшая адукацыя?» — пацікавіўся ў прысутных Анатоль Тозік. — Няўжо сярэдняй спецыяльнай адукацыі будзе недастаткова? Ці для бацькоў, якія вядуць дзіця ў садок, у першую чаргу, мае значэнне дыплом аб вышэйшай адукацыі, а не асоба выхавальніка?»

З 1 студзеня бягучага года заработная плата выхавальніка вышэйшай катэгорыі, які працуе на поўную стаўку, складзе 2 млн 300 тысяч рублёў, а выпускніка педагагічнай ВНУ, які яшчэ не мае кваліфікацыйнай катэгорыі (маладога спецыяліста), — 1 млн 901 тысяча рублёў. Шчыра кажучы, нават пасля павышэння тарыфнай стаўкі першага разраду заробкі педагогаў дашкольных устаноў выглядаюць больш чым сціпла...

— Адкажыце мне, калі ласка, на пытанне, а ці атрымлівае педагог, у групе якога знаходзяцца не 20, а 30 дзяцей (у паўтара раза больш за норму), заробак у паўтара раза большы? — пацікавіўся Анатоль Тозік.

Непапулярныя захады

З 1 студзеня 2013 года за работу ў перапоўненых групах выхавальнікі і памочнікі выхавальнікаў і сапраўды будуць атрымліваць даплату, адказалі яму, але сума гэтай даплаты настолькі мізэрная (15% ад тарыфнай стаўкі першага разраду для выхавальніка і 10% — для памочніка выхавальніка), што заўважыць такое «заахвочванне» будзе праблематычна.

— А ў колькі сёння абыходзіцца дзяржаве ўтрыманне дзіцяці ў дашкольнай установе? — працягваў цікавіцца віцэ-прэм'ер.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Высветлілася, што зараз гэта сума перавышае 13 мільёнаў рублёў за год, а рэальная патрэба складае 23 мільёны. Бацькі ж аплачваюць толькі 40% ад той сумы, што выдаткоўваецца на харчаванне дзіцяці. У залежнасці ад віду ўстановы і працягласці яе работы, бацькі плацяць штомесяц ад 110 да 148 тысяч рублёў. Калі павышаюцца грашовыя нормы на харчаванне — павышаецца прапарцыянальна і бацькоўская плата.

— Трэба разгледзець пытанне аб увядзенні дыферэнцаванага падыходу ў аплаце за дзіцячы садок. У нас ёсць дашкольныя ўстановы, пабудаваныя 30-40 гадоў таму, дзе прадстаўлены толькі неабходны мінімум для арганізацыі адукацыйнага і выхаваўчага працэсу, а ёсць дзіцячыя садкі з басейнамі, трэнажорнымі заламі і іншай суперсучаснай «начынкай». Між іншым бацькоўская плата і там, і там — аднолькавая... — падкрэсліў Анатоль Тозік.

Відавочна адно — бацькоўскі фінансавы ўдзел будзе расці. Найбольш верагодны ў бліжэйшы час варыянт — гэта паэтапнае павышэнне пакрыцця выдаткаў на харчаванне дзяцей (першы этап — з 40 да 60-70 працэнтаў).

— Калі мы паднімем бацькоўскую плату на 20%, па нашых разліках, заробкі педагогаў павялічацца ўсяго на 10% (гэта прыкладна ад 90 да 100 тысяч рублёў). І наўрад ці гэта прывядзе да нейкага эфекту, — падзяліўся сваім меркаваннем **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ**. — Значыць, трэба ісці іншым шляхам: або зрабіць так, каб бацькі кампенсавалі 100% выдаткаў на харчаванне сваіх дзяцей (з улікам захавання льгот для сацыяльна неабароненых сем'яў), або перайсці на рынкавыя новы падыход да аплаты за ўтрыманне дзіцяці ў дашкольнай установе, калі «цана» будзе залежаць ад якасці паслугі. Мы разумеем, што гэта непапулярны крок, і да яго давядзецца рыхтаваць грамадскую думку...

— Трэба быць абсалютна адкрытымі і шчырымі з бацькамі. Бацькі скардзяцца, што педагог не ўдзяляе дзіцяці дастатковай увагі. Дык за такія грошы, напэўна, і бацькі б не пайшлі ў дзіцячы садок працаваць? — дадаў Анатоль Тозік.

Дзіцячы сад у вашым доме

Сёння ў Беларусі знята забарона на размяшчэнне дашкольных устаноў у памяшканнях жылых дамоў. На думку Анатоля Тозіка, трэба больш актыўна карыстацца прадастаўленай магчымасцю, таму што невялікія дзіцячыя садкі (на 40-50 чалавек) хутчэй забяспечаць крокавую даступнасць:

— Гэта вельмі зручна, тым больш што такія праекты можа рэалізаваць не толькі дзяржава, але і прыватны бізнэс. Тыя сродкі, што закладзены дзяржавай на ўтрыманне дзіцяці ў дзяржаўнай установе, можна аддаць і прыватніку.

Прадстаўнікі сістэмы дашкольнай адукацыі папрасілі звярнуць увагу яшчэ на адну акалічнасць: у Мінскай вобласці, напрыклад, не пайшлі летась у першы клас 1726 шасцігадовых дзяцей. З іх 49% не мелі ніякіх супрацьпаказанняў да навучання ў школе. Бацькі проста вырашылі такім чынам падоўжыць сваім малым дзяцінства. Але ж усё гэта таксама патрабуе бюджэтных выдаткаў.

— А чаму мы выплачваем дзяржаўныя дапамогі маладым маці, якія імкнуцца аддаць сваіх дзяцей у дзіцячы садок, яшчэ знаходзячыся ў дэкрэтным адпачынку? — пацікавіўся, у сваю чаргу, Анатоль Тозік. — Выходзіць, што мы двойчы іх «субсідуем»: дзяржава фактычна аплачвае ўтрыманне дзіцяці ў дзіцячым садку плюс выплачвае дапамогу на дзіця ва ўзросце да трох гадоў непрацуючай маці. Але ж ці правільна гэта?

Паспрабавалі члены калегіі знайсці адказ і яшчэ на адно хвалюючае пытанне — што больш эканамічна мэтазгодна: будаваць больш дзіцячых садкоў у новых мікрараёнах або запаўняць пустыя месцы ў дзіцячых установах у цэнтры горада і арганізоўваць падвоз дзяцей? Сёння па краіне забяспечваецца падвоз больш як 10,5 тысячы малых.

— Мясцовыя выканаўчыя камітэты самі вырашаюць, што для іх больш перспектыўна: будаваць новыя дзіцячыя садкі з улікам далейшага развіцця мікрараёна ці арганізоўваць падвоз дзяцей. Але мы лічым, што вазіць дзяцей на вялікія адлегласці неперспектыўна, — упэўнена адказала начальнік упраўлення дашкольнай адукацыі міністэрства Галіна Макаранкава.

Надзея НІКАЛАЕВА,
г. Магілёў.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

FDI MAGAZINE: БЕЛАРУСЬ — АДЗІН З САМЫХ ПРАГРЭСІЎНЫХ РЭФАРМАТАРАЎ ВА УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

Часопіс Foreign Direct Investment Magazine — дадатак сусветна вядомага выдання The Financial Times — апублікаваў артыкулы пра VII Беларускі інвестыцыйны форум, які прайшоў у Мінску ў лістападзе 2012 года, паведамляе БЕЛТА.

Артыкулы напісаны рэдактарам часопіса Кортні Фінгар, якая прыняла ўдзел у інвестфоруме і выступіла мадэратарам яго пленарнага пасяджэння. На думку рэдактара часопіса, «зрухі ў лібералізацыі эканомікі ў Беларусі адназначна назіраюцца». «Беларусь з'яўляецца адным з самых прагрэсіўных рэфарматараў ва Усходняй Еўропе ў сферы развіцця бізнэсу», — сцвярджае Кортні Фінгар у сваім артыкуле. У справаздачы «Вядзенне бізнэсу», якая публікуецца Сусветным банкам, Беларусь паднялася са 115-га месца, якое займала ў 2007 годзе, на 58-е месца ў 2013 годзе. Урад краіны мае намер увайсці ў трыццатку лепшых у паказаным рэйтынгу. «Пазіцыі краіны ў рэйтынгах ужо значна вышэй пазіцый краін-суседзяў у рэгіёне Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі і ў два разы лепш пазіцый Расіі і Украіны, — звяртае ўвагу Кортні Фінгар. — У сусветным маштабе Беларусь займае 9-ы радок са 185 эканомік па лёгкасці адкрыцця бізнэсу».

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ІНТЭРНАТА ДЛЯ САСТАРЭЛЫХ

У Пастаўскім раёне, у населеным пункце Дунілавічы пасля рэканструкцыі адкрыўся псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Рэканструкцыя інтэрната была праведзена ў рамках выканання комплекснай праграмы развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011 — 2015 гады.

На 23 студзеня запланавана ўрачыстая цырымонія адкрыцця гэтай установы сацыяльнага прызначэння. У Віцебскай вобласці самая вялікая ў рэспубліцы колькасць дамоў-інтэрнатаў — 15. У іх пражывае каля 3,4 тыс. пенсіянераў і інвалідаў. Дарэчы, сярод гэтых устаноў — 5 дамоў-інтэрнатаў агульнага тыпу (на 765 месцаў), сярод якіх адзін спецыяльны, для асоб, вызваленых з месцаў пазбаўлення волі (для грамадзян, якія страцілі сацыяльныя сувязі са сваякамі). Дзейнічаюць на Віцебшчыне і 10 інтэрнатаў псіханеўралагічнага профілю на больш як 2,6 тыс. месцаў, у тым ліку адзін — для дзяцей на 272 месцы.

На будаўніцтва, рэканструкцыю, мадэрнізацыю і капітальны рамонт толькі ў мінулым годзе выдзелена і асвоена каля 65 мільярдаў рублёў. На ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сродкаў было накіравана ў чатыры разы больш, чым у 2011 годзе. На набыццё абсталявання выкарыстана сродкаў у 2,5 раза больш, чым за апошнія дзесяць гадоў.

Як канстатавалі ў Віцебскім аблвыканкаме, усё зробленае дазволіць ліквідаваць чаргу на пасяленне ў дамы-інтэрнаты, а таксама значна палепшыць якасць жыцця суграмадзян, якія пражываюць у іх. Цікавы факт: як вынік — сярэдняя працягласць жыцця ў інтэрнатах складае больш за 80 гадоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У НАСТУПНЫМ ГОДЗЕ ПОЙДЗЕМ У «КУРЫ»

Статус гісторыка-культурнай каштоўнасці набылі дзве славутасці Магілёўскай вобласці.

Першая нематэрыяльная каштоўнасць — абрад «Куры» ў Клічаўскім раёне. Ён унікальны, адзіны ў Беларусі дзіцячы калядны абрад. Яго ўдзельнікам — ад 4 да 16 гадоў. Старадаўняя традыцыя жыве дасюль: штогод 13 студзеня кампанія дзяцей, пераважна дзяўчынак, ідзе па вуліцах вёсак Дзмітраўка, Віркаў і Нясета. Дзеці спяваюць песні-калядкі, сярод якіх галоўная і абавязковая — «Куры, ня пейце рана». Яна дала назву абраду, а яго ўдзельнікаў клічуць «куранятамі». Гаспадары хат, дзе спыняюцца «кураняты», выносяць ім сала, бліны і цукеркі. Песні, адзенне і ход абраду дзеці пераймаюць ад сваіх бабуль, маці і старэйшых сясцёр.

Статус гісторыка-культурнай каштоўнасці таксама атрымала традыцыя паломніцтва і пакланення Блакітнай крыніцы, што ў Слаўгарадскім раёне. Гэтая крыніца — цікавы прыродны аб'ект і старажытная святыня. Яна выглядае як невялікае возера, дзе вада мае адметнае бірузовае адценне і пастаянную ў любы сезон тэмпературу ў 8 градусаў цяпла. Узімку крыніца не замярзае, і цяпер у ёй можна грэць рукі, а ўлетку патрэбна смеласць, каб выканаць традыцыю і тройчы перайсці крыніцу альбо акунуцца ў яе цалкам, на шчасце і здароўе. Цяпер крыніцу апякуе праваслаўная царква, і штогод на Мядовы Спас, альбо Макавей, тут адбываецца абрад асвячэння вады. Людзі вераць, што вада ў Блакітнай крыніцы гаючая.

Ілона ІВАНОВА.

САМАРОБНЫ ТРАКТАР ГАРЭЎ...

У Віцебску адбыўся пажар у прыватным гаражы. Гаспадар у вольны час збіраў там трактар.

— Як стала вядома, мужчына штодня працаваў у гаражы, у свой вольны час збіраў трактар. Для абагравання выкарыстоўваў газавую гарэлку. У гэты дзень, як звычайна, прыходзячы раніцай, пераапрануўся ў рабочую вопратку, адкрыў 5-літровы газавы балон і падпаліў гарэлку. Тут жа адбылася ўспышка і загарэлася прамасленая вопратка, — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — Мужчына спрабаваў збіць полымя, але беспаспяхова. І толькі, калі ён выбег на вуліцу і паваляўся ў снезе, яму ўдалося затушыць падпаленую вопратку. Пакуль пенсіянер «тушыў сябе», загарэлася маёмасць у гаражы...

А ў гэты час відавочцы ўжо выклікалі выратавальнікаў, якія ліквідавалі гарэнне. Прыехала і «хуткая дапамога». Мужчыну даставілі ў Віцебскую абласную бальніцу з апёкамі. У выніку пажару ў гаражы былі пашкоджаны самаробны трактар, маёмасць. Папярэдняя прычына пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі газавага абсталявання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МІР, СЯБРОЎСТВА, ШЛЮБ

Кожны чацвёрты са шлюбаў, якія рэгіструюцца ў Доме шлюбаў Мінгарвыканкама, — інтэрнацыянальны. Летась свае адносіны тут звязалі вузамі Гіменея больш як 400 міжнародных пар.

Як расказала загадчыца Дома шлюбаў Надзея Рэуцкая, геаграфія вясельных краін вельмі шырокая — іх больш чым 60. Лідзіруе Расія. Далей ідуць Італія, Германія, Ізраіль, Турцыя. Часам маладыя беларусы выбіраюць сабе ў мужы ці жонкі жыхароў такіх далёкіх краін, як Нігерыя, Венесуэла, Філіпіны, Японія. Зараз няроўныя шлюбы, калі жаніх або нявеста старэйшыя за партнёра на 20 і больш гадоў, — вялікая рэдкасць. Сярэдні ўзрост маладых 25—28 гадоў.

— Адносіны паміж краінамі сталі больш адкрытымі, — сказала Надзея Рэуцкая. — Маладыя людзі падарожнічаюць, знаёмяцца з культурай і традыцыямі іншых дзяржаў. Натуральна, кантактуюць, кахаюць. Заканамерна, што інтэрнацыянальных шлюбаў заключаецца больш: у кахання няма межаў.

Алеся ЗАГОРСКАЯ, *«Мінск—Навіны»*.

МЯНЯЎ НЕЛЕГАЛЬНА

Супрацоўнікі міліцыі і Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК затрымалі жыхара Пінскага раёна, які займаўся валютнымі спекуляцыямі.

Паводле аператыўных звестак, толькі з красавіка мінулага года на нелегальных валютных аперацыях мужчына зарабіў больш за 270 мільёнаў рублёў. Гэтага аказалася дастаткова, каб распачаць крымінальную справу за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. Пры затрыманні ў валютчыка было канфіскавана амаль 7,6 тысячы еўра, больш за 5 тысяч долараў, 67000 расійскіх рублёў, 100 украінскіх грыўняў.

Яна СВЕТАВА.

■ Спартыўны тыдзень

ПРАРЫЎ ГАНДБАЛІСТАЎ І СТАБІЛЬНЫ ГЛЕБ

Узгадваем галоўныя спартыўныя падзеі мінулага тыдня

1. Найперш адзначым перамогі гандбольнай зборнай Беларусі на чэмпіянаце свету, які зараз праходзіць у Іспаніі. Выступленне нашай мужчынскай каманды на падобных спаборніцтвах — ужо поспех, якім ганарыцца трэба. Апошні раз зборная Беларусі ўдзельнічала ў планетарным першынстве ў далёкім 1995 годзе, а таму ўдзел у сёлетнім чэмпіянаце — цудоўная нагода праверыць сябе на фоне моцных апанентаў. На жаль, зборным Славеніі, Польшчы і Сербіі нашы хлопцы саступілі, аднак змагаліся да апошняга, статыстамі дакладна не выглядалі. А вось у матчах з камандамі Паўднёвай Карэі і Саудаўскай Аравіі беларусы атрымалі перамогі. Асабліва клас нашай каманды адчуваўся ў паядынку з саудаўцамі, які вызначаў чацвёртага ўдзельніка групы «С» у 1/8 фіналу. Азіяты насамрэч нічога не здолелі супрацьпаставіць беларусам. А варатар Віталь Чарапенька наогул стаў для падапечных Ненада Кляіча загадкавым чарадзеем, які адбіваў добрую палову кідкоў саперніка. У выніку лік 33:15 канстатаваў пераканаўчую вікторыю беларусаў над трэцяй зборнай азіяцкага кантынента. У 1/8 фіналу беларусы ўчора позна вечарам сустрэліся з Харватыяй. Нельга не заўважыць і выдатную гульню нашага капітана Сяргея Рутэнкі, які з'яўляецца адным з лепшых бамбардзіраў першынства. На яго рахунку ўжо больш за 40 трапных кідкоў.

2. Былы паўабаронца «Барселоны» і лонданскага «Арсенала» Аляксандр Глеб падпісаў новы кантракт з барысаўскім БАТЭ. Сапраўды, пэўная частка балельшчыкаў не чакала ад тытулаванага гульца падобнага рашэння: хадзілі чуткі пра яго пераход у маскоўскі «Лакаматыў», пераезд у Германію. Толькі замест замежнай няўпэўненасці футбаліст выбраў БАТЭ і Лігу Еўропы. Цудоўны, між іншым, крок, асабліва для барысаўчан. У лютым ім гуляць у еўракубках з турэцкім «Фенербахчэ», а таму знаходжанне ў складзе Глеба павінна пазітыўна паўплываць на гульню каманды. «Глеб ужо не хлопчык і кожнае сваё рашэнне старанна ўзважвае, — адгукнуўся на навіну ў сваім анлайнавым дзённіку спартыўны журналіст Сяргей Канашыц. — Прыкметна пасталеў, і гэта вельмі цешыць. Прыемна чытаць кожнае ягонае інтэрв'ю і выказванне, там ужо няма пустых слоў і выхваляння, як гэта часта праскоквала раней. (...) Глеб — гэта вельмі цудоўна! Глеб — гэта лепш, чым тысяча Кежманаў!». Узгадаем яшчэ адзін футбольны трансфер, які не пакінуў абыякавымі нашу спартыўную прастору. Паўабаронца Станіслаў Драгун больш не гулец мінскага «Дынама». Былы лідар каманды Алега Пратасава падпісаў трохгадовае пагадненне з самарскім клубам «Крылы Саветаў». На беразе Волгі Драгуну сумна не будзе. У камандзе ён складзе кампанію суайчыннікам Сяргею Вяромку, Дзмітрыю Верхаўцову і Сяргею Карніленку.

3. Не вельмі добра завяршыўся для біятланісткі Дар'і Домрачавай чарговы этап Кубка свету, які адбываўся ў італьянскім Антхольцы. Домрачава толькі ў спрынце (7,5 км) узнялася на п'едэстал. Прапусціла наперад славачку Настассю Кузьміну і фінку Кяйсу Мякярайнен. У дзесяцікіламетровай гонцы Дар'я наогул заняла толькі 10-е месца. Эстафету наша жаночая каманда завяршыла на 7 месцы.

4. Працягвае радаваць сваіх прыхільнікаў тэнісістка Вікторыя Азаранка. У чацвёртым крузе Адкрытага чэмпіянату Аўстраліі лёгка перамагла расіянку Алену Весніну. Лік — 6:1, 6:1. У 1/4 супрацьстаяць Вікторыі будзе таксама грамадзянка Расіі — Святлана Кузняцова.

5. Даволі важную перамогу ў 1/8 фіналу валейбольнага Кубка выкліку атрымаў мінскі «Будаўнік». І не на сваёй пляцоўцы, а ў гасцях быў пераможаны 25-разовы чэмпіён Грэцыі «Алімпіякас» — 3:1. Для валейбола гэта добры вынік і цудоўная заяўка на праходжанне ў далейшую стадыю турніру. Але для большай упэўненасці хлопцам неабходна ваша падтрымка. Матч у адказ адбудзецца 24 студзеня ў мінскім Палацы спорту. Пачатак а 19:00.

Тарас ШЧЫРЫ

■ Гарачыя кропкі планеты

ЦІ СТАНЕ МАЛІ ДРУГІМ САМАЛІ?

Ужо больш як год афрыканская дзяржава Малі дэстабілізавана. У студзені 2012 года туарэгі пачалі чарговае паўстанне супраць цэнтральнага ўрада. Неэфектыўнасць яго задушэння з боку ўрадавых войскаў прывяла да дзяржаўнага перавароту. Скарыстаўшыся пераваротам і стратай кіравальнасці, па-сепаратысцку настроеныя туарэгі стварылі новую непрызнаную дзяржаву Азавад. У далейшым паўсталыя пачалі вайну паміж сабой, у якой перамаглі сілы, якія выступалі за стварэнне халіфата на тэрыторыі Азавада. А затым яны пачалі наступленне, каб захапіць астатнюю частку тэрыторыі Малі.

Падзеі ў Малі з'яўляюцца нядрэннай падставай для таго, каб задумацца аб недасканаласці існуючай сістэмы забеспячэння бяспекі ў свеце. ААН, якая заклікана быць вярхоўным гарантам непахіснасці палітычнай карты свету, функцыянуе, толькі калі з'яўляецца інструментам у руках групы моцных дзяржаў, якія імкнуцца дамагчыся рэалізацыі сваіх уласных мэт. Пры гэтым у іх павінен быць істотны інтарэс да праяўлення такой актыўнасці.

Успомнім хоць бы Лівію — імкненне перадзяліць велізарныя запасы нафты і газу і звесці старыя рахункі з Муамарам Кадафі з'ядналі групу заходніх і арабскіх дзяржаў, у сілу чаго яны змаглі дабіцца як рэзалюцыі ААН па Лівіі, так і правесці сілавую аперацыю ў сваіх інтарэсах, празмерна вольна інтэрпрэтаваўшы гэтую рэзалюцыю.

Усё значна больш сумна ў выпадку з дзяржавамі, якія не выклікаюць інтарэсу практычна ні ў кога. У іх мала карысных рэсурсаў, яны занадта аддаленыя ад багатых краін, каб сур'ёзна паўплываць на іх інтарэсы (з пункту гледжання апошніх).

Так адбылося з Самалі. Адсутнасць прыродных рэсурсаў, важных стымулаў улагоджваць сітуацыю ў краіне, прывяла да расколу краіны фактычна на некалькі частак на два дзесяцігоддзі, што спарадзіла феадальных баронаў і жудасную галечу. З багатых краін толькі ЗША паспрабавалі наскокам вырашыць праблему, але як толькі іх дэсантнікі пацярпелі першае сур'ёзнае паражэнне, тут жа з краіны ўцяклі.

А самалійцы, каб выжыць ва ўмовах фактычнага распаду краіны, адрадзілі старадаўні бізнэс — пірацтва. Толькі калі ў суседніх афрыканскіх краін лопнула цярпенне ў сувязі з тым, што тэрыторыя Самалі стала для іх крыніцай пастаянных праблем, і яны пачалі ўводзіць свае кантынгенты для аднаўлення кіравальнасці краіны, з'явіліся надзеі на стабілізацыю сітуацыі.

Сітуацыя з Малі падобная. У наяўнасці праблемы самалійскага тыпу. І адзінымі краінамі, якія адрэагавалі на рэзалюцыю ААН аб захаванні ранейшага канстытуцыйнага ладу заявай аб гатоўнасці ўводу войскаў для дапамогі ўраду, сталі афрыканскія суседзі. Але з-за беднаты рабіць гэта яны не спяшаліся. Давялося Францыі замест раней запланаванай рэалі па каардынацыі дзеянняў афрыканскіх войскаў уводзіць свае ўласныя войскі, каб спыніць паспяховае наступленне мяцежнікаў.

У наяўнасці прабуксоўка і іншага механізму — агульнай палітыкі бяспекі і абароны ЕС. Створаная калісьці пад фанфары, яна фактычна засталася «папяровым тыграм». Усім відавочна, што ад беспарадкаў у Малі найбольшыя страты панясе акрамя афрыканскіх суседзяў менавіта ЕС. Малі можа надоўга стаць яшчэ адной шырокай зонай для лагераў тэрарыстаў і крыніцай нелегальнай эміграцыі ў Еўрасаюз, але дзе ж агульныя інтарэсы 27 дзяржаў, што ўваходзяць у ЕС?

Тыя з іх, што больш бедныя, упэўнены, што гэта не іх праблема, паколькі тэрарысты атакуюць больш багатыя краіны ЕС і туды ж імкнуцца нелегальныя эмігранты. Але і багатыя краіны ЕС не могуць дамовіцца паміж сабой, як абараніць агульныя інтарэсы. Калі б гэта адбылося, то, як паказвае практыка, прымусіць бедных членаў ЕС пайсці іх шляхам — справа дробязная. Відавочна, што ЕС ёсць, а эфектыўнай агульнай палітыкі бяспекі і абароны ўсё яшчэ няма.

У сувязі з гэтым малійцам проста пашанцавала, што цэнтральны ўрад не на словах, а на справе пагадзілася падтрымаць хоць адна багатая краіна — Францыя. Калі стала відавочна, што афрыканскія краіны не спяшаюцца ўводзіць свае войскі для аказання дапамогі Малі і, хутчэй за ўсё, астатняя тэрыторыя краіны неўзабаве стане часткай новага халіфата, французы адважыліся ўвесці войскі для вядзення непасрэдных баявых дзеянняў на тэрыторыі сваёй былой ваеннай калоніі.

Першыя дзеянні супраць мяцежнікаў былі ўдалыя. Больш за тое, натхнёныя ўводам войскаў з Францыі, яе прыклад перанялі і афрыканскія краіны, якія перш пасіўна чакалі. Галоўным пытаннем для стабілізацыі сітуацыі ў Малі стане здольнасць хутка задушыць паўстанне. Калі гэтага не атрымаецца зрабіць, узнікнуць праблемы. Па-першае, пра падтрымку паўсталых ужо заявілі радыкальныя ісламісты ў іншых краінах. І тое, што гэтая заява не была пустымі словамі, прадэманстраваў захоп закладнікаў у Алжыры з гібеллю дзясяткаў чалавек, у тым ліку грамадзян заходніх краін.

Калі падобныя дзеянні будуць ажыццяўляцца і далей, і ў тым ліку на тэрыторыі Францыі, то з-за абурэння грамадзян, якія падвергнуліся тэрору, яна можа ўзяць прыклад з ЗША ў 1990-х гадах, што ўцяклі з Самалі. Па-другое, для доўгіх баявых дзеянняў у Францыі патрэба больш актыўна карыстацца прадастаўленай магчымасцю, таму што невялікія дзіцячыя садкі (на 40-50 чалавек) хутчэй забяспечаць крокавую даступнасць:

Працяглае выкарыстанне тысяч вайскоўцаў за мяжой з непазбежнай стратай дарагой баявой тэхнікі і выплатамі параненым і загінулым салдатам нанясе моцны ўдар па бюджэце краіны, якая перажывае не лепшыя эканамічныя часы, і можа прывесці да згортвання аперацыі.

Сяргей КІЗІМА,
загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук

■

ХТО ПА ВАДУ, А ХТО — У ВАДУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сотні ахвотнікаў набраць асвячонай вады і акунуцца ў купелі і ў палонцы запоўнілі ў суботні дзень на Вадохрышча ўсю плошчу крынічнага комплексу ў Лагойску на беразе ракі Гайны. Нягледзячы на тое, што мароз сягаў пад -16, каля царквы ў гонар святога Мікалая назіралася сапраўднае паломніцтва. Чэргі былі як па крынічную ваду, так і сярод тых, хто, пераадолеўшы сябе, адважыўся на «маржаванне». Сярод тых, хто пажадаў асвяціцца вадохрышчынскай вадой, пераважалі паломнікі са сталіцы.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

«АД ІМЯ МНОГІХ ПРАГРЭСІЎНЫХ НЕМЦАЎ ПРОСІМ ПРАБАЧЭННЯ...»

ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

Ёсць такая катэгорыя людзей — жыхары спаленых вёсак, тыя, што засталіся ў жывых. Афіцыйнага прызнання ахвярамі вайны яны не маюць, ніякіх кампенсацыйных выплат не атрымліваюць. Аднак нядаўна іх статус быў прызнаны берлінскім аб'яднаннем «Кантакты»: 200 чалавек атрымалі матэрыяльную дапамогу, а галоўнае — лісты са словамі прабачэння. Аднак такому акту прызнання папярэднічала вялікая праца.

У свеце няма аналагічных выпадкаў

Наталля Кірылава — каардынатар міжнароднага праекта, які ажыццяўляе Беларускі фонд міру пад эгідай нямецкага фонду «Памяць, адказнасць, будучыня». Іх партнёрскай арганізацыяй з'яўляецца Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Праект мае назву «Павышэнне статусу жыхароў спаленых вёсак» і адпрацаваў ужо два гады. Пра яго расказвае Наталля Кірылава:

— Нідзе ў свеце няма такіх ахвяр. Напрыклад, у Чэхіі быў спалены адзін населены пункт Лідзіца — там створаны мемарыяльны комплекс. У Францыі знішчана адно паселішча разам з жыхарамі — гэта Орадур-сюр-Глан. Таму такой агульнапрызнанай катэгорыі людзей — жыхары спаленых вёсак — у свеце няма. У Беларусі ж было знішчана каля 10 000 вёсак — і вялізная колькасць з іх была спалена разам з жыхарамі. Толькі малой частцы насельніцтва гэтых мясцін нейкім цудам удалося выжыць: яны не трапілі ў канцлагеры, хаваліся ў лясах, балотах, у партызанскіх лагерах. Таму адна з мэт праекта — данесці да сусветнай грамадскасці, што ў Беларусі засталося яшчэ вельмі шмат жыхароў спаленых вёсак. У той час яны былі маленькімі дзецьмі, якія вынеслі вельмі страшныя пакуты, перажылі вялікія ўзрушэнні — і маральныя, і фізічныя. На іх вачах былі знішчаны родныя, блізкія, былі спалены іх хаты. Яны бадзяліся па лясах, мерзлі, галадалі, хварэлі. Аднак афіцыйна яны дагэтуль не лічацца ахвярамі нацызму. Бо ў свеце няма аналагічных выпадкаў.

9 тысяч жыхароў спаленых вёсак

Наталля Кірылава не па чутках ведае гэтых людзей: дзесяць гадоў яна была дырэктарам мемарыяльнага комплексу «Хатынь», а дагэтуль яшчэ шмат часу адпрацавала там. На многія дзесяцігоддзі ў мемарыяльным комплексе яна запрашала жыхароў спаленых вёсак, праводзіла з імі работу. Па яе ініцыятыве і быў створаны праект «Павышэнне статусу жыхароў спаленых вёсак». Калі яна распачынала яго, нават не ўяўляла, колькі важным ён акажацца для гэтых людзей і які розгалас зможа атрымаць:

— Першапачаткова праект задумваўся як гуманітарны, не прадугледжваў ніякіх грашовых выплат. Ажыццяўляе яго Беларускі фонд міру, які з'яўляецца разгалінаванай установай і мае абласныя і раённыя аддзяленні. Яго супрацоўнікі, знаходзячыся на месцах, складалі спісы жыхароў спаленых вёсак. Асабліва вялікую працу ў гэтым кірунку зрабілі Віцебскі і Магілёўскі абласныя аддзяленні Беларускага фонду міру, значная праца прыпала і на Віцебскі музей Героя Савецкага Саюза Міная Шмырова. Мы ўжо вывелі пэўную лічбу — я не хачу сцвярджаць, што яна дакладная, — 9 тысяч жыхароў спаленых вёсак засталося ў Беларусі.

З усімі гэтымі людзьмі адразу працаваць немагчыма, адзначае Кірылава, бо яны жывуць па ўсёй краіне. Аднак ужо стварылася група з 50 чалавек, якія ўдзельнічаюць ва ўсіх мерапрыемствах: акцыях памяці, сустрэчах пакаленняў, канферэнцыях, пасяджэннях «круглых сталоў». Ладзяцца і пазнавальныя паездкі — у Мір, Нясвіж, Жыровічы, Дальву — разам яны аб'ездзілі многія памятныя мясціны краіны.

Па меры магчымасці, каардынатары праекта дапамагаюць сваім падапечным у вырашэнні розных бытавых пытанняў: звяртаюцца да мясцовых улад, якія заўсёды адгукаюцца і робяць усё магчымае, дасылаюць запыты ў медыцынскія ўстановы.

Наталля Кірылава ўсведамляе ўсю важнасць працы, якая праводзіцца:

— Гэтыя людзі вельмі ўдзячныя, што на іх нарэшце звярнулі ўвагу. Сама справа вельмі карпатлівая, але важная. Бо праходзіць час, і такія рэчы хутка забываюцца. Ужо шмат было сказана і пра тое, што ёсць спробы сказіць гістарычную праўду. Калі мы такую працу не зробім, то хутка гэта ўсё адыдзе ў нябыт. Складана будзе расказаць пра тое, што перажыла Беларусь, якія страты панесла; пра тое, што загінуў у нас кожны трэці, што столькі спалена вёсак. Калі мы пачыналі наш праект, нават не ўяўлялі, што будзем мець такі вынік — нават нямецкі бок прызнаў гэтых людзей ахвярамі.

На іх вачах былі знішчаны родныя, блізкія, былі спалены іх хаты. Яны бадзяліся па лясах, мерзлі, галадалі, хварэлі. Аднак афіцыйна яны дагэтуль не лічацца ахвярамі нацызму.

Ёсць «Кантакт» з Верхнядзвінскам

Падчас Другой сусветнай вайны найбольш пацярпеў Верхнядзвінскі раён: там быў знішчаны кожны другі жыхар, не засталося ніводнай пабудовы — фактычна гэты раён быў сцёрты з твару зямлі. Так склаліся абставіны, што лёсам выратаваных жыхароў Верхнядзвінскага раёна як найбольш пацярпелага ў гады Вялікай Айчыннай вайны зацікавіліся прадстаўнікі берлінскага аб'яднання «Кантакты». Адным з асноўных кірункаў дзейнасці гэтай арганізацыі з'яўляецца ўмацаванне ўзаемаразумення паміж народамі і гісторыка-асветніцкая праца: яны аказваюць маральную і матэрыяльную падтрымку «забытым» ахвярам нацызму (якія не атрымалі кампенсацыйных выплат з Германіі і не фігуравалі ў гістарычнай памяці ФРГ).

Прадстаўнікі «Кантактаў» былі моцна ўражаны тым, што некалі адбылося ў Верхнядзвінскім раёне. Яны адзначалі: «У нас пра гэта ніхто не ведае». Нямецкі бок стаў супрацоўнічаць з беларускім і задаваць шмат пытанняў: «Што гэта за людзі? Што ім давялося перажыць? Колькі іх засталося?» Беларускі фонд міру пачаў вельмі шчыльна працаваць з Верхнядзвінскім райвыканкамам, з мясцовымі краязнаўцамі. Усе ўдакладненыя даныя яны паведамлялі прадстаўнікам «Кантактаў». Немцы зацікавіліся, якая колькасць людзей засталася ў жывых, і захацелі аказаць ім матэрыяльную дапамогу. Зараз яе атрымалі ўжо 200 жыхароў спаленых вёсак. Але самае галоўнае — гэта ліст, дасланы кожнаму з іх. З яго вынікае, што немцы сапраўды адчулі гэтую трагедыю. Прыводзім урывак з паслання:

«Нагода да напісання гэтага ліста знаходзіцца ў нашым мінулым. Аднак гэтае мінулае значнае для нас і сёння. Ужо няма больш руінаў вайны. Паміж брацкімі магіламі на алеях вайны растуць дрэвы. Але па-ранейшаму гучыць звон Хатыні. Каб жахі Другой сусветнай ніколі больш не паўтарыліся.

Для гэтага ліста ёсць і яшчэ адна важная прычына, што адносіцца ўжо да нядаўніх палітычных падзей. Вы дагэтуль не атрымалі афіцыйных слоў прабачэння ад нямецкага парламента і кіраўніцтва ФРГ за тыя пакуты, што былі прычынены вам у гады вайны. У 1999 г. Бундэстаг прыняў закон аб кампенсацыйных выплатах пацярпелым ад фашысцкай тыраніі ва Усходняй Еўропе, уключаючы і былы СССР. Гэта не толькі грошы, але яшчэ і прызнанне адказнасці за падзеі мінулага. У законе ні слова не сказана пра пацярпелых у спаленых беларускіх вёсках. Нямецкія палітыкі не думалі пра вас. Нам сорамна за гэта.

...Мы схіляем галаву ў знак памяці пра вашых родных, блізкіх і суседзяў, што сталі ахвярамі гэтага злачынства. Мы просім у тых, хто выжыў, прабачэння ад імя многіх прагрэсіўных немцаў...»

Жыхары спаленых вёсак падчас наведвання палаца Радзівілаў у Нясвіжы.

Дзеянне праекта «Павышэнне статусу жыхароў спаленых вёсак» працягнута яшчэ на два гады. Хутчэй за ўсё, ён будзе працаваць і далей. Бо для пацярпелых людзей такая справа надзвычай важная.

У лютым-сакавіку спаўняецца 70 гадоў Асвейскай трагедыі. Гэта самая крывавая падзея, якая была здзейснена фашыстамі ў Беларусі. Падчас аперацыі пад кодавай назвай «Зімовае чараўніцтва» былі знішчаны практычна два раёны, разам з людзьмі і ўсімі пабудовамі, — Асвейскі і Дрысненскі, якія зараз уваходзяць у склад Верхнядзвінскага раёна. Таму ў канцы зімы — на пачатку вясны ў Верхнядзвінску адбудзецца канферэнцыя, у якой прымуць удзел як жыхары спаленых вёсак, так і маладое пакаленне, якому неабходна перадаць на захаванне гістарычную памяць.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Ад рэдакцыі: *каб прыняць удзел у канферэнцыі ў Верхнядзвінску, можна звязацца з Наталляй Віктараўнай Кірылавай, напісаўшы на адрас электроннай пошты: n.v.kirillova@tut.by.*

■ З першых крокаў

ЖАДАННЕ БАЦЬКОЎ І ПАДТРЫМКА ЎЛАД

У Гродне адкрылася першая беларускамоўная група ў дзіцячым садку

Некалькі гадоў таму «Звязда» ўжо звярталася да гэтай тэмы, пісала пра тое, што ў Гродне праводзіцца агітацыйная праца па стварэнні беларускамоўных груп у дзіцячых садках. Аднак, на жаль, безвынікова. Але нарэшце, так бы мовіць, лёд крануўся: з пачатку верасня мінулага года ва ўстанове адукацыі «Яслі-сад № 45» па вуліцы Сухамбаева з'явілася група, дзе ўсе заняткі праводзяцца па-беларуску.

Загадчыца гэтай дашкольнай установы Валянціна ПЯТРОЎСКАЯ расказвае, што спачатку ў групе было дзевяць дзяцей, а цяпер ужо дванаццаць. Гэта па-ранейшаму менш, чым у іншых групах, аднак дапушчальна, паколькі беларускамоўная група рознаўзроставая: у асноўным дзецям ад трох да чатырох гадоў, але ёсць і «ясельныя» — двухгадовыя. Для кожнага ўзросту — адпаведныя фізічныя і іншыя заняткі, харчаванне. А адным з аб'яднальных фактараў у гэтым калектыве з'яўляецца беларуская мова. І калі, напрыклад, Валянціна Іванаўна заходзіць у гэтую групу, то з ёй вітаюцца па-беларуску.

У беларускамоўнай групе працуюць дзве **выхавальніцы — Іна СЕВЯРЫН** і **Іна СЦЯПУРА**. Тое, што група рознаўзроставая, — не праблема. Нават добра, бо старэйшыя дапамагаюць малодшым. Пры гэтым усе праграмы, заняткі — толькі па-беларуску. На думку выпускніцы філфака Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы Іны Севярын, галоўная мэта — каб дзеці больш чулі беларускую мову, выхоўваліся ў беларускамоўным асяроддзі, бо рускай мове яны і так навучацца.

Выхавальніцы ўжо заўважылі

Калі Іна Севярын прыходзіць на замену калегам у іншыя групы і пачынае там размаўляць па-беларуску, то дзеці не разумеюць, чаго яна ад іх хоча.

два складнікі стаўлення да беларускай мовы з боку дзетак: спачатку — разуменне, а пасля ўжо — вымаўленне. Праўда, не ўсе яшчэ добра гавораць, але... Калі Іна Севярын прыходзіць на замену калегам у іншыя групы і пачынае там размаўляць па-беларуску, то дзеці не разумеюць, чаго яна ад іх хоча. А дзеці з беларускамоўнай групы ўжо ўсё разумеюць.

Іна Севярын, дарэчы, раней сутыкалася з праблемай працаўладкавання. Здаралася, у дзіцячым садку яе не хацелі браць на працу, паколькі размаўляе па-беларуску, а бацькі, маўляў, не вельмі хочуць, каб было двухмоўе. Таму Іна, даведаўшыся, што адкрываецца беларускамоўная група, з задавальненнем адгукнулася на запрашэнне тут працаваць. Пры гэтым выхавальніцы дапамагаюць калегам з іншых груп у перакладзе тых ці іншых матэрыялаў на беларускую мову. А нядаўна Іна Севярын разам са сваімі сябрамі і супрацоўнікамі дашкольнай установы падрыхтавала для дзяцей (не толькі з беларускамоўнай групы — усіх) «Калядкі». Упершыню ў жыцці дзеці ўбачылі, што сабой уяўляе калядаванне, хто такія калядоўшчыкі.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА

«Калядкі».

Дарэчы, практычна ўсе дапаможнікі для заняткаў з дзецьмі выхавальніцы сёння самі перакладаюць з рускай мовы на беларускую. Для іх гэта не праблема. Аднак чаму пэўная частка дапаможнікаў для дашкольных устаноў не павінна быць беларускамоўнай?

Бацькі (дзякуючы іх ініцыятыве ў Гродне і адкрылася першая беларускамоўная група ў дзіцячым садку) возяць сюды сваіх дзяцей з розных куткоў горада. Яны аб'ядноўваліся праз сацыяльныя сеткі, знаёмых, на розных імпрэзах.

— Калі ў 2009 годзе нарадзіўся сын, мы з мужам дакладна вырашылі: зробім усё, што ад нас залежыць, каб наша дзіця пайшло ў беларускамоўную групу дашкольнай установы. І для нас было вялікім шчасцем, што ўдалося сабраць подпісы іншых бацькоў, а ўлады пайшлі насустрач. Веру, што калі атрымалася ў нас, то далей гэтыя групы будуць толькі развівацца. І да школы нашы дзеткі прыйдуць, можа, няпоўным, але беларускамоўным класам, — гаворыць Наталля КІСЕЛЬ.

Начальнік аддзела адукацыі Гродзенскага гарвыканкама Сяргей БЛАЖЭЙ:

— Мы ўжо не першы год праводзім агітацыйную працу, каб ствараліся беларускамоўныя групы ў дзіцячых садках альбо класы ў сярэдніх школах. Запускаем гукавыя ролікі ў тралейбусах і аўтобусах, выпускаем лістоўкі, патрабуем, каб у кожным дзіцячым садку была адпаведная інфармацыя для бацькоў. Самае галоўнае — гэта жаданне бацькоў. І пры іх жаданні мы заўсёды пойдзем насустрач і знойдзем магчымасць. Цяжкасці такія, што ў новых мікрараёнах, дзе пакуль не хапае дзіцячых садкоў і групы перапоўнены, праблематычна з памяшканнямі. Аднак і ў адным, і ў другім раёне горада ёсць дзіцячыя садкі, дзе можна стварыць беларускамоўныя групы. Гэтае пытанне можа разглядацца нават тады, калі спачатку ёсць усяго чатыры-пяць заяў ад бацькоў. Бо, як правіла, на момант, калі фарміруюцца групы, заяў не хапае, а потым з'яўляюцца ахвотныя.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА

Выхаванцы беларускамоўнай групы разам з работнікамі дзіцячага садка і бацькамі.

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

— знакавае імя ў беларускай дзіцячай літаратуры. А яшчэ — і сапраўдны педагог для некалькіх пакаленняў паэтаў, празаікаў, журналістаў. За гады працы ў часопісах «Бярозка» і «Вясёлка» ён дапамог многім юным талентам знайсці сябе ў стасунках з мастацкім словам, вызначыць сваё ўласнае месца ў творчым свеце. Гаворачы пра Міколу Чарняўскага, ловіш сябе на думцы, што поруч з ім можна было б называць і цэлую школу літаратараў, да сталення якіх ён прычыніўся сваім прафесіяналізмам, усім сваім сэрцам. Учора ў Доме літаратара прайшоў творчы вечар паэта-юбіляра. А Саюз пісьменнікаў Беларусі адзначыў Міколу Чарняўскага медалём «За вялікі ўклад у літаратуру». «Звязда» ж знаёміць чытача з новымі вершамі таленавітага творцы.

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

НА РОДНАЙ ЗЯМЛІ...

Ці роспач з тугой,
Ці слязінкі з вачэй
Свой вузел
балюча завяжуць, —
На роднай зямлі,
Дзе б ні жыў ты,
Хутчэй
Іх кожны спагадна
заўважыць.

На роднай зямлі —
І нямілась мілей,
Душа, як вуглі,
не астыне,
Праменьчык —
адзіны —
Сагрэе цяплей,
Чым сонца — усё —
На чужыне.

ДУБОК

Са сцежкі
саступіўшы ўбок,
Каб не зазнаць няласкі нечай,
На ўзлеску кволенькі дубок,
Бы ў ладкі б'е,
Лісцём трапеча.

Ён рады сонцу, рады дню,
Падхоплены птушыным спевам,
Каб мог,
Сягнуў бы ў вышыню,
Каб стаць раўнёй суседнім дрэвам.

Ды нельга вырвацца з палону
Зямлі і чэпкіх каранёў:
Расці павінен па закону
Прыроды іх —
Дуброў, гаёў.

Наўкол яго — бярозкі, хвойкі,
Гуртком, бы выбеглі з садка...
Чый хрэснік ён?
Ці ўвішнай сойкі,
Ці рук рупліўца-лесніка?

Яму ў сямейцы шумнай, свойскай,
Не сумна дні свае вітаць.
Ды надта хочацца з бярозкай,
Бялявай, стройнай,
Побач стаць.

Ён падрасце, яе дагоніць.
Ён верыць, што настане дзень —
Свой ліст шырокі, як далоні,
Ёй на плячо
Ён пакладзе.

СУСТРЭЦЬ СВЯТА СНЕГУ НА ЛЫЖАХ!

Снежная зіма сёлета парадавала ўсіх удзельнікаў Сусветнага свята снегу, што адзначаўся па ўсёй краіне 20 студзеня.

Адкрыццё спартыўнага свята ў рамках акцыі «Сусветны дзень снегу» адбылося ў Мінску на гарадской лыжаролернай трасе. Тут праходзілі спаборніцтвы, удзел у якіх прыняло больш за 200 лыжнікаў. Лыжныя гонкі, хакей, конкурсы снегавікоў — спартыўна-забаўляльныя мерапрыемствы прайшлі больш чым у 100 гарадах краіны. Асноўныя мерапрыемствы былі арганізаваны ва ўсіх абласных цэнтрах і Мінску. Асаблівасцю беларускага дня снегу сёлета стаў удзел у падрыхтоўцы і правядзенні свята школьнікаў і студэнтаў, бо, па задумцы арганізатараў, галоўная ідэя сёлетняга свята — «Вернем дзяцей на снег!». Каардынатарам Сусветнага дня снегу ў Беларусі з'яўляецца Беларускі лыжны саюз. Афіцыйны партнёр свята — Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ). Ініцыятыву таксама падтрымала Міністэрства спорту і турызму Беларусі і рэгіянальныя ўпраўленні па фізкультуры і спорце.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У НЕКАТОРЫЯ ЗАКОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ РЭКЛАМЫ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 17 снежня 2012 года

Ухвалены Саветам Рэспублікі 20 снежня 2012 года

Артыкул 1. Частку другую артыкула 29 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 года «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 1998 года (ЗЗ БССР, 1990 г., № 4, арт. 46; Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 28, арт. 461; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 276, 2/1603) выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Рэклама на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь размяшчаецца (распаўсюджваецца) на беларускай і (або) рускай мовах. Гэта палажэнне не распаўсюджваецца на рэкламу, якая размяшчаецца (распаўсюджваецца) на радыё, тэлебачанні, у друкаваных выданнях і на інфармацыйных рэсурсах нацыянальнага сегмента глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт, якія размяшчаюць (распаўсюджваюць) інфармацыю выключна на замежных мовах, рэкламу таварных знакаў і (або) знакаў абслугоўвання, а таксама на рэкламу, што змяшчае агульнапрынятыя замежныя тэрміны і абазначэнні, якія ўвайшлі ў прымяненне ў арыгінальным напісанні і (або) не маюць абазначэння на беларускай і (або) рускай мовах, выкананыя на замежнай мове назвы таваraў, творчыя псеўданімы, арыгінальныя назвы творчых калектываў, твораў, дамены, імёны сайтаў або запрашэнні на работу ці вучобу асоб, якія свабодна валодаюць замежнымі мовамі.».

Артыкул 2. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 мая 2007 года «Аб рэкламе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 119, 2/1321; 2008 г., № 196, 2/1525; 2009 г., № 276, 2/1607; 2010 г., № 6, 2/1647) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. У артыкуле 2:

пасля абзаца другога дапоўніць артыкул абзацам наступнага зместу:

«мультымедыйная рэклама (контррэклама) — рэклама (контррэклама), якая размяшчаецца (распаўсюджваецца) з дапамогай праграмна-тэхнічных сродкаў, якія рэалізуюць інфармацыю ў гукавым і (або) глядзельным выглядзе (тэкст, графіка, фатаграфія, відэа, мультыплікацыя (анімацыя), гукавыя эфекты і інш.), за выключэннем рэкламы (контррэкламы), якая размяшчаецца (распаўсюджваецца) на тэлебачанні і радыё;»;

абзацы трэці—пятнаццаты лічыць адпаведна абзацамі чацвёртым—шаснаццатым;

абзац чацвёрты выкласці ў наступнай рэдакцыі;

«вонкавая рэклама — рэклама, якая размяшчаецца (распаўсюджваецца) з выкарыстаннем сродкаў вонкавай рэкламы на знешніх баках будынкаў (збудаванняў), па-за будынкамі (збудаваннямі) і ў падземных пешаходных пераходах;»;

пасля абзаца шостага дапоўніць артыкул абзацам наступнага зместу:

«плошча рэкламы (контррэкламы) — велічыня паверхні, якая спецыяльна прызначана і (або) выкарыстоўваецца для размяшчэння (распаўсюджвання) рэкламы (контррэкламы);»;

абзацы сёмы—шаснаццаты лічыць адпаведна абзацамі восьмым—сямнаццатым;

з абзаца дзявятага словы «прызначаная для няпэўнага кола асоб (спажыўцоў рэкламы),» выключыць;

у абзацы шаснаццатым словы «дзяржаўных праграм у сферах аховы здароўя, адукацыі» замяніць словамі «праграм па пытаннях развіцця адукацыі, дзяржаўных праграм у сферах аховы здароўя»;

дапоўніць артыкул абзацам васямнаццатым наступнага зместу:

«эквівалентны ўзровень гуку — усярэдненае значэнне сілы гуку (энергетычнае ўсярэдненне).».

2. Артыкул 3 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 3. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь у галіне рэкламы

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь вызначаны іншыя правілы, чым тыя, якія змяшчаюцца ў гэтым Законе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.».

3. У артыкуле 7:

пасля абзаца трэцяга дапоўніць артыкул абзацам наступнага зместу:

«стварае Міжведамасную раду па рэкламе;»;

абзацы чацвёрты—восьмы лічыць адпаведна абзацамі пятым—дзявятым;

абзацы пяты і шосты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«вызначае парадак вытворчасці і размяшчэння (распаўсюджвання) сацыяльнай рэкламы, уключаючы парадак удзелу Міжведамаснай рады па рэкламе ў ацэнцы якасці сацыяльнай рэкламы;

вызначае парадак размяшчэння (распаўсюджвання) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь рэкламы таваraў, якія вырабляюцца на гэтай тэрыторыі, рэкламы алькагольных напояў у сродках масавай інфармацыі, размяшчэння сродкаў вонкавай рэкламы, а таксама парадак размяшчэння (распаўсюджвання) і ўзгаднення вонкавай рэкламы, рэкламы на аўтамабілях, трамваях, тралейбусах, колавых трактарах, аўтацягніка, калі іншае не вызначана прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;»;

абзац сёмы выключыць;

абзацы восьмы і дзявяты лічыць адпаведна абзацамі сёмым і восьмым.

4. У артыкуле 8:

абзац чацвёрты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«ажыццяўляе кантроль у галіне рэкламнай дзейнасці;»;

з абзаца шостага слова «парушальнікам» выключыць;

абзац сёмы выключыць;

абзацы восьмы—дзясяты лічыць адпаведна абзацамі сёмым—дзявятым.

5. У артыкуле 9:

у абзацы першым слова «Мясцовыя» замяніць словамі «1. Мясцовыя»;

з абзаца трэцяга слова «парушальнікам» выключыць;

абзац чацвёрты выключыць;

абзацы пяты—дзявяты лічыць адпаведна абзацамі чацвёртым—восьмым;

у абзацы сёмым словы «аўтамабільных транспартных сродках, трамваях, тралейбусах» замяніць словамі «аўтамабілях, трамваях, тралейбусах, колавых трактарах, аўтацягніках»;

дапоўніць артыкул пунктам 2 наступнага зместу:

«2. Абласныя, гарадскія, уключаючы Мінскі гарадскі, раённыя выканаўчыя камітэты ажыццяўляюць кантроль у галіне рэкламнай дзейнасці.».

6. Дапоўніць Закон артыкуламі 9^1 наступнага зместу:

«Артыкул 9^1. Міжведамасная рада па рэкламе

1. Міжведамасная рада па рэкламе ствараецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у мэтах удасканалювання ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, рэкламавытворцаў, рэкламараспаўсюджвальнікаў па пытаннях стварэння спрыяльных умоў для ўстойлівага развіцця рэкламнага рынку ў Рэспубліцы Беларусь, абароны грамадства ад неналежнай рэкламы, а таксама для выпрацоўкі рэкамендацый па правядзенні адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне рэкламы, рэгуляванні рэкламнай дзейнасці, ацэнкі якасці сацыяльнай рэкламы.

2. Палажэнне аб Міжведамаснай радзе па рэкламе і склад Міжведамаснай рады па рэкламе зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

3. Арганізацыйнае і інфармацыйнае забеспячэнне работы Міжведамаснай рады па рэкламе ажыццяўляецца Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.».

7. У артыкуле 10:

частку першую пункта 2 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«2. Рэклама на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь размяшчаецца (распаўсюджваецца) на беларускай і (або) рускай мовах. Гэтае палажэнне не распаўсюджваецца на рэкламу, якая размяшчаецца (распаўсюджваецца) на радыё, тэлебачанні, у друкаваных выданнях і на інфармацыйных рэсурсах нацыянальнага сегмента глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт (далей — сетка інтэрнэт), якія размяшчаюць (распаўсюджваюць) інфармацыю выключна на замежных мовах, рэкламу таварных знакаў і (або) знакаў абслугоўвання, а таксама на рэкламу, якая змяшчае агульнапрынятыя замежныя тэрміны і абазначэнні, якія ўвайшлі ў прымяненне ў арыгінальным напісанні і (або) не маюць абазначэння на беларускай і (або) рускай мовах, выкананыя на замежнай мове найменні таваraў, творчыя псеўданімы, арыгінальныя назвы творчых калектываў, твораў, дамены, імёны сайтаў або запрашэнні на працу або вучобу асоб, якія свабодна валодаюць замежнымі мовамі.»;

пункт 3 дапоўніць трэцім сказам наступнага зместу: «Пры гэтым данае ўказанне выконваецца шрыфтам, памер якога не павінен быць меншым за памер шрыфту, які выкарыстоўваецца для напісання сродку індывідуалізацыі тавару, а ў рэкламе на тэлебачанні і мультымедыйнай рэкламе павінна размяшчацца (распаўсюджвацца) на працягу ўсяго часу рэкламы, а ў рэкламе на радыё — агучвацца.»;

пункт 4 пасля слоў «і радыё,» дапоўніць словамі «сродку вонкавай рэкламы, транспартным сродку, праз сотавую рухомую электрасувязь аператарамі электрасувязі,»;

частку другую пункта 6 выключыць;

пункт 7 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«7. Папераджальныя надпісы і іншая абавязковая да размяшчэння ў рэкламе інфармацыя павінны быць выкананы выразнымі літарамі і колерам, які кантрастуе з колеравым фонам плошчы рэкламы, на якой размяшчаецца інфармацыя.

Указаныя ў рэкламе зноскі, якія ўдакладняюць інфармацыю, якая размяшчаецца ў рэкламе, нумары тэлефонаў, даменнае імя сайта, нумар і дата выпуску друкаванага сродку масавай інфармацыі, які змяшчае інфармацыю аб аб'екце рэкламавання, выконваецца выразнымі літарамі і шрыфтам, памер якога не павінен быць меншым за палову найбольшага памеру шрыфту, які выкарыстоўваецца ў рэкламе. Такая інфармацыя ў рэкламе на тэлебачанні і мультымедыйнай рэкламе павінна займаць не менш за пяць секундаў, пры працягласці ўказанай рэкламы менш за пяць секундаў — размяшчацца (распаўсюджвацца) на працягу ўсяго часу рэкламы, а ў рэкламе на радыё — агучвацца.»;

у пункце 8:

з абзаца трэцяга словы «або выказваць меркаванне аб» выключыць;

дапоўніць пункт абзацам чацвёртым наступнага зместу:

«змяшчаць указанне на лячэбныя ўласцівасці аб'екта рэкламавання, за выключэннем рэкламы лекавых сродкаў, метадаў аказання медыцынскай дапамогі, работ і (або) паслуг, якія складаюць медыцынскую дзейнасць, вырабаў медыцынскага прызначэння і медыцынскай тэхнікі.»;

абзац трэці пункта 9 пасля слова «выкарыстання» дапоўніць словамі «ў сацыяльнай рэкламе, рэкламе медыцынскай дзейнасці рэкламадаўца, а таксама»;

у пункце 10:

абзац чацвёрты дапоўніць словамі «, аналагаў наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, інфармацыя пра якіх размешчана на афіцыйным сайце Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь у сетцы інтэрнэт»;

абзац пяты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«попыту і (або) прапаноў органаў і (або) тканак чалавека;»;

абзац дзясяты дапоўніць словамі «, а таксама паслуг па навучанні ўказанай дзейнасці»;

дапоўніць пункт абзацам дванаццатым наступнага зместу:

«дзейнасці асоб, не зарэгістраваных у якасці юрыдычных асоб або індывідуальных прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь, па прыцягненні грашовых сродкаў, электронных грошай і іншай маёмасці грамадзян пад выплату даходу.»;

пункт 11 пасля слоў «рэкламы, за выключэннем» дапоўніць словамі «сацыяльнай рэкламы,».

8. У артыкуле 11:

у абзацы чацвёртым пункта 1 словы «30 працэнтаў аб'ёму вяшчання» замяніць словамі «16 хвілін»;

пункт 5 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«5. Працягласць кожнага перарывання перадачы рэкламай, у тым ліку мастацкага фільма, не павінна перавышаць шасці хвілін, за выключэннем перыяду з 18.00 да 22.00. дапускаецца перарыванне перадач рэкламай, у тым ліку мастацкіх фільмаў, не больш за чатыры разы на працягу гадзіны эфірнага часу.»;

пункт 7 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«7. Размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламы эратычнай прадукцыі, прадукцыі, якая змяшчае элементы эротыкі, а таксама паслуг, звязаных з распаўсюджваннем такой прадукцыі, на тэлебачанні і радыё дапускаецца з 24.00 да 4.00.»;

абзац першы пункта 10 пасля слова «Патрабаванні» дапоўніць словамі «пунктаў 1—9 і 11»;

пункт 11 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«11. Параметры суадносін эквівалентнага ўзроўню гуку рэкламы, паведамлення аб яе наступнай трансляцыі і эквівалентнага ўзроўню гуку праграмы, якая транслюецца і перарываецца рэкламай, а таксама метады вымярэння эквівалентнага ўзроўню гуку рэкламы і эквівалентнага ўзроўню гуку праграмы, якая транслюецца і перарываецца рэкламай, вызначаюцца абавязковымі для выканання патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў.».

9. Пункт 1 артыкула 12 дапоўніць трэцім сказам наступнага зместу. «У выпадку, калі згода абанента або адрасата на атрыманне рэкламы ўключаецца ў дагавор на аказанне паслуг тэлефоннай, тэлекснай, факсімільнай, сотавай рухомай электрасувязі, электроннай пошты, што заключаецца з абанентам або адрасатам у пісьмовай форме, абанент або адрасат павінен быць праінфармаваны аб праве патрабаваць ад рэкламараспаўсюджвальніка неадкладна спынення размяшчэння (распаўсюджвання) рэкламы на яго адрас, пра што ў дагаворы павінна змяшчацца адпаведная адзнака, засведчаная подпісам абанента або адрасата.».

10. Пункт 2 артыкула 13 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«2. Размяшчэнне сродку вонкавай рэкламы арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам або грамадзянінам, які ажыццяўляе адвакацкую дзейнасць, прыватную натарыяльную дзейнасць, рамесную дзейнасць або дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, дапускаецца пры наяўнасці размяшчэння адпаведнага Мінскага гарадскога, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання), раённага выканаўчага камітэта, які выдаецца ў парадку, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Пералік сродкаў вонкавай рэкламы, на якія не патрабуецца такога дазволу, вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. У выпадку размяшчэння сродку вонкавай рэкламы ў межах прыдарожнай паласы (кантраляванай зоны) аўтамабільнай дарогі, чырвоных ліній вуліц, дарог і плошчаў населеных пунктаў такі дазвол выдаецца пасля атрымання названым мясцовым выканаўчым і распарадчым органам узгаднення адпаведнага ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, упраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі ўпраўлення ўнутраных спраў абласнога выканаўчага камітэта, аддзела Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі ўпраўлення, аддзела ўнутраных спраў гарадскога, раённага выканаўчага камітэта, на тэрыторыі якога размяшчаецца сродак вонкавай рэкламы.

Вонкавая рэклама павінна быць узгоднена арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам або грамадзянінам, які ажыццяўляе адвакацкую дзейнасць, прыватную натарыяльную дзейнасць, рамесную дзейнасць або дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, якія атрымалі дазвол на размяшчэнне сродку вонкавай рэкламы, з адпаведным Мінскім гарадскім, гарадскім (горада абласнога падпарадкавання), раённым выканаўчым камітэтам. Пры наяўнасці такога ўзгаднення наступнае размяшчэнне (распаўсюджванне) вонкавай рэкламы дапускаецца без паўторнага ўзгаднення. Парадак узгаднення вонкавай рэкламы вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.».

11. Артыкулы 14 і 15 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 14. Рэклама на транспартным сродку

1. Размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламы на транспартным сродку не павінна перашкаджаць бяспекі руху.

2. Размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламы на аўтамабілі, трамваі, тралейбусе, колавым трактары, аўтацягніку арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам або грамадзянінам, які ажыццяўляе адвакацкую дзейнасць, прыватную натарыяльную дзейнасць, рамесную дзейнасць або дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, дапускаецца пасля ўзгаднення рэкламы з адпаведным Мінскім гарадскім, гарадскім (горада абласнога падпарадкавання), раённым выканаўчым камітэтам, на тэрыторыі якога зарэгістраваны гэты транспартны сродак. Такое ўзгадненне ажыццяўляецца пасля атрымання названым мясцовым выканаўчым і распарадчым органам узгаднення рэкламы з адпаведным упраўленнем Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі ўпраўлення ўнутраных спраў абласнога выканаўчага камітэта, аддзела Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі ўпраўлення, аддзела ўнутраных спраў гарадскога, раённага выканаўчага камітэта, на тэрыторыі якога размяшчаецца сродак вонкавай рэкламы.

Вонкавая рэклама павінна быць узгоднена арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам або грамадзянінам, які ажыццяўляе адвакацкую дзейнасць, прыватную натарыяльную дзейнасць, рамесную дзейнасць або дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, дапускаецца пры наяўнасці размяшчэння адпаведнага Мінскага гарадскога, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання), раённага выканаўчага камітэта, які выдаецца ў парадку, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Пералік сродкаў вонкавай рэкламы, на якія не патрабуецца такога дазволу, вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. У выпадку размяшчэння сродку вонкавай рэкламы ў межах прыдарожнай паласы (кантраляванай зоны) аўтамабільнай дарогі, чырвоных ліній вуліц, дарог і плошчаў населеных пунктаў такі дазвол выдаецца пасля атрымання названым мясцовым выканаўчым і распарадчым органам узгаднення адпаведнага ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, упраўлення

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ВЫСАКАРОДНАЯ ПРАФЕСІЯ — РАТАВАЦЬ ЛЮДЗЕЙ

Напярэдадні Дня выратавальніка ў Магілёўскім абласным упраўленні МНС падвялі вынікі года і ўручылі ўзнагароды лепшым супрацоўнікам.

Летась у рэгіёне адбыліся 944 пажары, што старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік назваў «гістарычным мінімумам» за апошнія два дзясяткі гадоў і добрым вынікам сумеснай працы выратавальнікаў, уладаў і грамадскасці.

Колькасць ахвяр паменшылася ў параўнанні з папярэднім годам на 30 чалавек, але, на вялікі жаль, на пажарах летась загінула 6 дзяцей. Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка, які прыехаў у Магілёў, падкрэсліў, што асноўная ўвага ў прафілактычнай працы будзе накіравана на сем'і з дзецьмі, асабліва праблемныя. Таксама важны клопат — старыя людзі, якія маюць патрэбу ў дапамозе.

Ілона ІВАНОВА.

НОВАЯ ПАЖАРНАЯ ЧАСЦЬ

Напярэдадні Дня выратавальніка ў Гродне адкрылася пажарная аварыйна-выратавальная часць № 7, што звязана з істотным пашырэннем межаў абласнога цэнтра ў паўднёва-заходнім кірунку.

У зоне адказнасці новай пажарнай часці, дзякуючы якой выратавальнікі будуць хутчэй прыбываць да месца выкліку, — мікрараёны Вішнявец, Альшанка, пасёлак Паўднёвы, дзе пражывае каля 80 тысяч чалавек, а таксама больш за 20 населеных пунктаў Гродзенскага раёна, дачныя таварыствы і шэраг прадпрыемстваў. На ўзбраенні выратавальнікаў — 4 аўтамабілі, 2 аўтацыстэрны і аўтамабіль хуткага рэагавання са спецыяльным абсталяваннем для ліквідацыі розных надзвычайных сітуацый. У прыватнасці, ёсць 52-метровая аўталесвіца, якая дасягае вышыні 15 паверха. На будаўніцтва і аснашчэнне пажарнай частцы затрачана больш за 20 мільярдаў рублёў з абласнога бюджэту, частку тэхнікі набылі за кошт рэспубліканскага бюджэту.

У перспектыве пажарныя падраздзяленні з'явяцца ў мікрараёнах Зарыца, Баранавічы і ў прамысловай зоне Аўльс, інфармуе прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ХТО ПЛАЦІЦЬ БУДЗЕ?

У сталіцы самая вялікая запазычанасць па аплаце паслуг ЖКГ лічыцца за 57-гадовым мінчанінам, які пражывае па вуліцы Чарвякова.

Сума пратэрмінаванай запазычанасці за жыллёва-камунальныя паслугі (ЖКП) у самага злоснага неплацельшчыка з вуліцы Чарвякова працягвае расці.

57-гадовы наймальнік аднапакаёвай кватэры, як паведамілі карэспандэнту агенцтва «Мінск-Навіны» ў РДЦ № 1 ЖРЭА Цэнтральнага раёна, не плаціць за ЖКП на працягу некалькіх гадоў. Па стане на 1 студзеня гэтага года сума запазычанасці дасягнула 66 млн 433 тыс. рублёў (з іх амаль 48 млн — пеня, астатняе — асноўны доўг). Аднак у неплацельшчыка не могуць нават адключыць камунальныя паслугі, не кажучы пра перасяленне ў менш камфортнае жыллё. Прычына ў тым, што ў кватэры зарэгістравана 7 чалавек, уключаючы непаўналетніх.

— Двое з іх жывуць у SOS-дзіцячай вёсцы ў Бараўлянах — іх маці пазбаўлена бацькоўскіх правоў, а дзеці хоць і выбылі і выпісаліся з кватэры, але плошча ў ёй замацавана за імі рашэннем адміністрацыі раёна, — патлумачыў начальнік РДЦ № 1 ЖРЭА Цэнтральнага раёна Аляксей Сальнік. — Яшчэ трое дзяцей з бацькамі перабраліся ў здымную кватэру. Гэта значыць, непаўналетнія ўнукі кватэранаймальніка-даўжніка фактычна з ім не пражываюць. Але гэтыя абставіны, згодна з дзейным заканадаўствам, не могуць з'яўляцца прычынай для прыняцця да яго якіх-небудзь радыкальных захадаў па спагнанні запазычанасці. Неплацельшчык ігнаруе любыя папярэджанні, а таксама прапановы ўладкавацца на працу ў ЖЭС і пачаць пагашаць доўг.

«Мінск-Навіны».

З-ЗА ЕЖЫ НА ЭЛЕКТРАПЛІЦЕ...

У райцэнтры Паставы на вуліцы Гайдара з-за пакінутай без нагляду ежы на ўключанай электрапліце адбыўся пажар у адным з інтэрнатаў даччынага камунальнага ўнітарнага аграрна-будаўнічага прадпрыемства.

Паводле інфармацыі прэс-службы Віцебскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, пажар адбыўся каля сямі гадзін вечара ў пакоі на другім паверсе будынка інтэрната. Пажарнымі быў выратаваны чалавек, які пражываў у пакоі. Ён быў шпіталізаваны ў стане алкагольнага ап'янення з атручваннем прадуктамі гарэння. Устаноўлена прычына пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання (пакінутая без нагляду ежа на ўключанай электрапліце).

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АДКУЛЬ СІЛЫ ЎЗЯЛІСЯ?

Работнікі Жлобінскай міжрайінспекцыі знайшлі ў лесе месца здабычы дзіка. Адпаведныя сляды на снезе сведчылі, што тушу звезлі на санях. Сляды палазоў прывялі дзяржінспектараў у вёску Асінаўка Жлобінскага раёна да дома аднаго з мясцовых жыхароў.

Разам з аператыўнікамі інспектары агледзелі дом і гаспадарчыя пабудовы і знайшлі разабраную тушу дзіка з прыкметамі агнястрэльнага ранення, а таксама зарэгістраваную паляўнічую стрэльбу. Зброю і мяса канфіскавалі для правядзення экспертызы.

— Застаецца толькі здагадвацца, як з гэтай ношай справіўся 77-гадовы мужчына, — заўважылі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. — Следства падазрае, што ён дзейнічаў не адзін. Браканьера чакае крымінальная адказнасць за незаконнае паляванне, якое нанесла шкоду прыродзе ў памеры 6 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЯМЕЙНЫ НАРКАБІЗНЭС

Жыхарка Жлобіна, якая працавала буфетчыцай у адным з бараў раённага цэнтра, гандлявала не толькі стравамі і напоямі, але і... наркотыкамі.

Пра гэта стала вядома не толькі прыхільнікам забаронена-га зелля, але і праваахоўнікам. Не ў лепшы для жанчыны час да яе наведаліся супрацоўнікі аддзялення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Жлобінскага РАУС разам з падраздзяленнем міліцыі спецыяльнага прызначэння палка ППСМ. Тайнік з марыхуанай міліцыянеры знайшлі на працоўным месцы. У кватэры таксама быў выяўлены пакунак з высушанымі каноплямі, вага якога склала амаль 400 г. Высветлілася, што і муж затрыманай быў далучаны да наркабізнэсу, які прыносіў неблагія прыбыткі. Цяпер раённым аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа па факце незаконнага абароту наркатычных сродкаў у буйным памеры. Як расказаў начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Гомельскага УУС Юрый Маркевіч, за мінулы год пры правядзенні прафілактычных і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па недапушчэнні распаўсюджвання наркотыкаў у месцах масавага адпачынку моладзі былі выяўлены 23 злачынствы, звязаныя з абаротам наркотыкаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У СЭКСУАЛЬНАЕ РАБСТВА

На Віцебшчыне зараз расследуюцца дзве крымінальныя справы ў дачыненні да асоб, якія арганізоўвалі гандаль людзьмі, або былі пасрэднікамі.

Як паведаміў «Звяздзе» Уладзімір Шалухін, начальнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці, два зладзеі ўжо асуджаны. У прыватнасці, у мінулым годзе завялі крымінальную справу ў дачыненні да грамадзяніна нашай краіны, які завербаваў у Віцебску дзвюх дзяўчат, спрабаваў іх вывезці ў Падольск з мэтай сэксуальнай эксплуатацыі. Крымінальная справа разгледжана ў судзе. Злодзей правядзе за дротам сем гадоў. У яго канфіскавалі маёмасць. На аналагічны тэрмін пазбаўленне волі з канфіскацыяй маёмасці асуджаны яшчэ адзін наш суграмадзянін, які таксама арганізоўваў выезд у Расію нашых дзяўчат, каб яны там займаліся прастытуцыяй.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Паралелі

ЭЛЕКТРОННАЯ СПРАВАЗДАЧНАСЦЬ СУПРАЦЬ ПАПЯРОВАЙ ВАЛАКІТЫ,

або Хто ці што аблегчыць жыццё педагогаў?

Міністэрства адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі плануе распрацаваць да канца гэтага года новую электронную сістэму, з дапамогай якой федэральныя, рэгіянальныя і муніцыпальныя органы ўлады змогуць ацэньваць дзейнасць школ і яе супрацоўнікаў. Акрамя таго, электронная сістэма дазволіць адсочваць адпаведнасць настаўнікаў і дырэктараў іх пасадзе, якую тыя займаюць. Зараз атэстацыя педагагічных работнікаў на адпаведнасць пасадзе праводзіцца ў Расіі адзін раз у пяць гадоў, што не дае магчымасці ацэньваць дзейнасць настаўнікаў у рэальным часе.

Правяраецца адпаведнасць

Правядзенне такога маніторынгу асабліва актуальна ва ўмовах, калі ва ўсіх расійскіх адукацыйных установах уведзены новы парадак атэстацыі педагагічных работнікаў, лічаць у расійскім Міністэрстве адукацыі і навукі. Пад «атэстацыяй педагагічных работнікаў» маецца на ўвазе набор тэстаў на прафесійную прыдатнасць настаўніка. Правяраецца адпаведнасць узроўню кваліфікацыі настаўніка яго пасадзе. Акрамя звестак, якія прадастаўляюцца настаўнікам і самой школай, педагог абавязаны прайсці тэсты ў пісьмовай форме па сваім профільным кірунку.

Ацэньваць адпаведнасць рэальнай сітуацыі вынікам атэстацыі настаўнікаў будзе спецыяльна створаная камісія. Акрамя таго, новая сістэма маніторынгу будзе ўзаемадзейнічаць з комплекснай інфармацыйна-аналітычнай сістэмай.

Перад запускам сістэмы маніторынгу міністэрства сумесна з Асацыяцыяй дырэктараў школ і стараннімі экспертамі правяло даследаванні ў 13 суб'ектах Расійскай Федэрацыі, уключаючы Маскву. У прыватнасці, было ўстаноўлена, што найбольш намаганняў у педагогаў аднімаюць розныя справаздачы аб правядзенні мерапрыемстваў і паспяховасці навучэнцаў за чвэрць і паўгоддзе, інфармацыя аб выкананні федэральных праграм, планы выхаваўчай работы. Канчатковая мэта Міністэрства адукацыі і навукі — стварэнне Адзінай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы маніторынгу сферы адукацыі, якая павінна аб'яднаць усе інфармацыйныя сістэмы школ і органаў кіравання ў адзінае цэнтральнае сховішча звестак.

— Важна ствараць на ўзроўні школ такую базу з усімі патрэбнымі звесткамі, каб арганізацыі, якім патрэбная тая ці іншая інфармацыя, маглі ўзяць яе адтуль, не робячы дадатковых запытаў, — упэўнены **навуковы кіраўнік Інстытута праблем развіцця адукацыі «Эўрыка» Аляксандр АДАМСКІ**.

— Настаўнікі зараз даволі часта ўзнімаюць праблему вялікіх аб'ёмаў справаздачнасці. Адказнасць па запаўненні электронных формаў зноў-такі ляжа на іх, — лічыць **старшыня Расійскага прафсаюза работнікаў адукацыі Андрэй ДЗЯМІДАЎ.** Тым не менш, на думку старшыні прафсаюза, перавод школ на электронную справаздачнасць з'яўляецца станоўчым момантам і, магчыма, усё ж скароціць час на складанне дакументацыі.

Атэстацыя і заахвочванне

У Беларусі восенню мінулага года таксама быў зацверджаны новы парадак атэстацыі педагагічных работнікаў, які падвергся жорсткай крытыцы з боку педагагічнай грамадскасці. Згодна з новым дакументам, вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю беларускім педагогам трэба цяпер пацвярджаць кожныя пяць гадоў. Наймальнік можа паставіць пад сумненне кваліфікацыйную катэгорыю свайго работніка. А па выніках атэстацыйнай гутаркі кваліфікацыйную катэгорыю педагога могуць як павысіць, так і панізіць, і нават увогуле пазбавіць яго кваліфікацыйнай катэгорыі.

— Думаць, што ўсе педагогі будуць задаволены гэтым рашэннем, было б вельмі наіўна, — парыруе **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ**. — Патрабаванне рэгулярна пацвярджаць «вышэйшы пілатаж» у сваёй прафесіі не можа быць папулярнай мерай. Але я ўпэўнены, што гэта рашэнне правільнае, і многія педагогі з ім згодныя, асабліва тыя, хто ідзе на крок—два наперадзе іншых. Заробак педагога павінен залежаць ад яго майстэрства, ад узроўню і якасці яго работы. «Ураўнілаўкі» ў такім пытанні быць не павінна. Таму мы цалкам падтрымліваем прапанову нашага галіновага прафсаюза аб павелічэнні дыферэнцыяцыі ў памерах даплат за кваліфікацыйныя катэгорыі. Сёння педагогі не задаволены тым, што, розніца, скажам, паміж першай і вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй зусім неістотная. А цяпер яшчэ і давядзецца вышэйшую катэгорыю пацвярджаць. Таму нельга не пагадзіцца з педагогамі, якія лічаць, што вышэйшая катэгорыя павінна быць не проста маральным стымулам, але і інструментам фінансавага заахвочвання. Каб педагог быў упэўнены: калі ён зможа даказаць сваю адпаведнасць вышэйшай катэгорыі, гэта абавязкова адаб'ецца і на яго заробках.

Атрымаць катэгорыю «настаўнік-метадыст» будзе асабліва складана, бо абавязковай умовай яе прысваення з'яўляецца наяўнасць аўтарскай методыкі выкладання

Паводле слоў Сяргея Маскевіча, пакуль што ёсць пэўныя нюансы з заахвочваннем уладальнікаў новай катэгорыі «настаўнік-метадыст» (у прыватнасці, не вызначаны памеры даплат), але, нягледзячы на гэтую акалічнасць, паступіла ўжо больш як тысяча заявак ад педагогаў, якія гатовы даказаць сваё права на атрыманне гэтай катэгорыі. Між іншым атрымаць катэгорыю «настаўнік-метадыст» будзе асабліва складана, бо абавязковай умовай яе прысваення з'яўляецца наяўнасць аўтарскай методыкі выкладання вучэбнага прадмета або ўласнага досведу, які быў абагульнены і выкарыстоўваецца іншымі педагогамі. У «багажы» педагога павінны быць публікацыі ў навукова-метадычных і іншых выданнях аб вопыце прымянення сучасных адукацыйных, выхаваўчых і інфармацыйных тэхналогій і выкарыстання эфектыўных педагагічных формаў, метадаў і сродкаў навучання. Адным словам, не можа не ўражваць такі аптымізм нашых педагогаў.

Не кожная «паперка» абавязковая

Сяргей Маскевіч не ўтойвае, што праблема залішняй справаздачнасці актуальная і для беларускіх школ.

— Мы зараз працуем над нарматыўна-прававым дакументам, які будзе рэгламентаваць работу сайтаў установ адукацыі і іх напаўненне. У прыватнасці, будуць вызначаны старонкі, якія ў абавязковым парадку павінны прысутнічаць на ўсіх сайтах установ адукацыі. Да слова, ужо сёння некаторыя ўстановы адукацыі могуць пахваліцца паўнавартаснымі цікавымі сайтамі, максімальна карыснымі для сваіх наведнікаў. І ў іх стваральнікаў ёсць чаму павучыцца. Але ў пераважнай большасці работа над сайтамі вядзецца выключна дзеля «галачкі», таму і ніякай карысці ад іх няма. Я добра ведаю, што ў школы паступае шмат інфармацыі з розных крыніц аб усялякіх мерапрыемствах, якія праводзяць грамадскія аб'яднанні і арганізацыі, упраўленні і аддзелы МНС, МУС, аўтаінспекцыя і гэтак далей. І ўся гэта інфармацыя даводзіцца затым да кожнага педагога. Я лічу, што дастаткова размясціць такую інфармацыю на сайце ўстановы, і далей кожны педагог павінен дзейнічаць паводле свайго меркавання: хоча — удзельнічае, а не хоча — няхай ігнаруе. Нельга кожную «паперку», што прыходзіць у школу, разглядаць як абавязковую для выканання. Хоць некаторыя кіраўнікі ўстаноў адукацыі менавіта так і паступаюць.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Будзь у курсе

ПЛАТНАЕ НАВУЧАННЕ ПАДАРАЖЭЕ

Кошт навучання ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах зноў узрасце, што звязана з павелічэннем з 1 студзеня 2013 года тарыфнай стаўкі першага разраду. Аб гэтым журналісту «Звязды» паведаміў міністр адукацыі Сяргей Маскевіч:

— Натуральна, што ўслед за павелічэннем тарыфнай стаўкі першага разраду павінны вырасці і заробкі прафесарска-выкладчыцкага саставу. А значыць, плата за навучанне будзе пераглядацца...

Паводле слоў міністра, сёння студэнты платнай формы навучання не пакрываюць усе выдаткі, якія нясе ВНУ. Напрыклад, у Белдзяржуніверсітэце студэнты-платнікі пакрываюць толькі 42% усіх выдаткаў.

— Аднак не варта думаць, што ўсе грошы, якія ўносяцца студэнтамі платнай формы навучання, ідуць на заробкі выкладчыкам. У гуманітарных ВНУ на кожнага выкладчыка сёння прыпадаюць 10 студэнтаў. Дапусцім, кожны з іх уносіць за сваё навучанне ў сярэднім штогод 10 мільёнаў рублёў. У гэтым выпадку заробак выкладчыка павінен быў бы перавышаць 8 мільёнаў штомесяц. Але ж насамрэч гэта не так. Ёсць і іншыя артыкулы выдаткаў на падрыхтоўку спецыялістаў — тыя ж камунальныя плацяжы. Мы ўжо ведаем прапановы установ адукацыі па павышэнні сумы платы за навучанне, але пакуль няма інфармацыі пра карэктуючыя каэфіцыенты да тарыфных разрадаў, з дакладнымі лічбамі вызначыцца праблематычна. Мяркую, што плата за навучанне ўзрасце прапарцыянальна росту заробкаў.

Трэба дадаць, што ўзровень аплаты ў канкрэтнай ВНУ можа залежаць ад спецыяльнасці, якую атрымлівае студэнт, кваліфікацыі, стажу работы прафесарска-выкладчыцкага саставу і іншых педработнікаў, а таксама стану матэрыяльна-тэхнічнай базы. Традыцыйна самай дарагой (прычым не толькі ў нас, але і ва ўсім свеце) з'яўляецца вышэйшая медыцынская адукацыя. Але кошт навучання ў БДУ і БДУІР на некаторых спецыяльнасцях літаральна наступае на пяты платнай падрыхтоўцы медыкаў.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

Гісторыя — як выбар Лёсу...

20 студзеня пайшоў з жыцця археолаг, кандыдат гістарычных навук Міхась Чарняўскі, чалавек, якога добра ведае ўся Беларусь, а не толькі навуковы свет...

Міхась Чарняўскі быў з тых людзей, каму да ўсяго была справа — не толькі да Археалогіі і Гісторыі, у якіх ён быў спецыялістам вышэйшай катэгорыі. З душою і сэрцам ён ставіўся да ўсіх сапраўдных праяў беларускай культуры, літаратуры. Аб'ездзіўшы многія мясціны Беларусі, правёўшы безліч дзён у археалагічных экспедыцыях, вандроўках, што яму адкрывалі іншыя стагоддзі, дапамагалі ўявіць карціну жыцця нашых продкаў, Міхась Чарняўскі не шкадаваў часу для раскрыцця вядомых яму таямніц. Стараўся данесці свае веды да тысяч і тысяч людзей... Суайчыннікі павінны і зараз сказаць яму дзякуй за цудоўна напісаныя кнігі «Вогнепаклоннікі», «Страла Расамахі», «Правадыр крылатых вершнікаў»... Першыя дзве са згаданых ніколькі не горшыя, а месцамі і нашмат цікавейшыя за многія прыгодніцкія, гістарычныя раманы замежных пісьменнікаў. І «Вогнепаклоннікі», і «Страла Расамахі» чытаюцца на адным дыханні. А шмат каго з сучаснай моладзі захапілі гісторыяй настолькі, што яна стала іх прафесіяй. Міхась Чарняўскі — адзін з аўтараў акадэмічных «Археалогіі Беларусі», «Нарысаў па археалогіі Беларусі», «Гісторыі беларускага мастацтва». Для беларускіх энцыклапедый археолаг напісаў больш за дзвесце артыкулаў. У многім дзякуючы менавіта ініцыятыве, асведчанасці Міхася Чарняўскага па-новаму загучалі на старонках «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» многія факты беларускай даўніны.

Асобы такога маштабу, як Міхась Чарняўскі, і пасля сваёй смерці застаюцца, прысутнічаюць у свядомасці сваіх суайчыннікаў...

■ Бяспека на дарогах

ДРЭННАМУ КІРОЎЦУ... МАШЫНА ПЕРАШКАДЖАЕ

На Віцебшчыне выклікае трывогу нізкі ўзровень падрыхтоўкі новаспечаных вадзіцеляў і многіх з тых, хто ўжо не першы год за рулём. Шмат якія суграмадзяне, па назіраннях спецыялістаў, проста псіхалагічна не гатовы вадзіць машыну. Шмат пытанняў да арганізацыі работы ў аўташколах. А яшчэ прапаноўваецца кіроўцам, якія некалькі разоў селі за руль у нецвярозым стане, ставіць на наркалагічны ўлік. Безумоўна, органам дзяржаўнай улады рознага ўзроўню трэба думаць над тым, каб забяспечыць парадак на дарогах.

Фота БЕЛТА.

— Штогод расце колькасць транспарту. Раней прырост быў 19-20 тысяч адзінак аўто (і гэта толькі па Віцебскай вобласці). Але летась «парк» павялічыўся ўсяго на 5 тысяч машын, бо аўто падаражэлі пасля ўводу ў дзеянне мытных пошлін у межах Мытнага саюза. Умовы руху па дарогах складаныя, патрабуюць карэктыў, у тым ліку і ў псіхафізіялагічнай падрыхтоўцы вадзіцеляў, — расказвае **Айвар ЖОРАЎ, старшы інспектар па асаблівых даручэннях упраўлення ДАІ Віцебскай вобласці.** — Напрыклад, ідзе паток машын па праспекце. Усе трапляюць у так званую «зялёную хвалю», але знойдзецца адзін дурань, які пачынае «гуляць у шашкі» на дарозе: ад святлафора набірае хуткасць, потым пачынае рэзка зніжаць яе. А гэта ўжо стварэнне аварыйнай сітуацыі. Узнікае пытанне: хто выдаваў яму даведку? Як яго абследавалі? А трэба, каб не проста даведку выдалі ў псіханеўралагічным дыспансэры, а правялі паглыбленае псіхафізіялагічнае даследаванне...

Насамрэч маюць рацыю тыя, хто прапаноўвае, што ўрачы павінны дакладна вызначыць: прыдатны чалавек да кіравання аўто ці не? Па-другое, добра было, калі б чалавек, які «папаўся» за рулём у нецвярозым стане, пазбаўляўся правоў назаўсёды з-за непрыдатнасці да ваджэння. Аб тым, што ён у будучыні зможа зноў кіраваць аўто, і размовы быць не павінна. Рэальныя гісторыі палохаюць. Адзін пажылы чалавек восем разоў прыцягваўся за кіраванне аўто ў нецвярозым стане, на яго рахунку два ДТЗ — і што? Як з гусі вада...

Наконт дзейнасці аўташкол. Лічыцца, што калі з першай спробы 30 працэнтаў курсантаў такіх школ не здалі на правы — гэта добры паказчык. На Віцебшчыне зараз дзейнічае каля 70 аўташкол. Летась было 74. У адных забіраюць ліцэнзіі — выдаюць іншым.

З боку ДАІ праводзіцца кантроль іх дзейнасці: два разы на год аб'яўляюцца дэкады «Вучэбны аўтамабіль».

— Мы правяраем не дакументацыю школы, а парадак арганізацыі практычнага ваджэння. І выяўляецца шмат парушэнняў, — расказваюць у ДАІ. — Напрыклад, калі дзяўчыне-курсанту трэба падчас заняткаў гадзіну ездзіць, едзе хвілін сорак. У выніку многія жанчыны не ведаюць, як заправіць аўто. Многія курсанты не могуць ездзіць на аўто заднім ходам, трапіць у гараж не могуць. Гэта не падрыхтоўка!

Выпаў першы снег, і колькасць сутыкненняў вырасла з 15-20 да 56.

Ёсць такія грамадзяне, хто па 35-40 разоў здаюць экзамены для атрымання правоў. Трэба колькасць гадзін па практычным ваджэнні павялічваць разы ў два — як мінімум, упэўнены інспектары. Мяняць неабходна ўсю сістэму падрыхтоўкі.

Як аказалася, нават параўнальна вопытныя вадзіцелі псіхалагічна не гатовы да рэзкай перамены надвор'я. Выпаў першы снег, і колькасць сутыкненняў вырасла з 15-20 да 56. Вадзіцелі не змаглі зарыентавацца...

У Расіі ёсць нямала школ «экстрэмальнага кіравання». У нас бы такія адкрыліся! На Віцебшчыне, як адзначылі ў ДАІ, былі б вельмі запатрабаваны такія курсы ваджэння ў экстрэмальных умовах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

ОДО «ЮгАгро» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже дебиторской задолженности, принадлежащей ОДО «ЮгАгро»

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5, комн. 1, моб.: (8029) 621-22-36, тел. 68-26-34.

Продавец дебиторской задолженности: ОДО «ЮгАгро», г. Гомель, Привокзальная площадь, д. 1

Аукцион состоится **01.02.2013 г. в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, д. 5, комн. 1.**

Наименование дебитора	Место нахождения имущества (дебиторской задолженности)	Номинальная стоимость задолженности	Размер уценки	Начальная цена продажи, без НДС, руб.	Шаг аукциона, руб.	Задаток, руб.
Лот № 2. КСУП «Нивы» (задолженность по судебному приказу № 3-8037/11-15 от 27.07.2012 г.)	Жлобинский район, Солонский с/с, ул. Советская, 29, комн. 409	17 080 256	90%	1 708 025	85 400	85 400
Лот № 3. КСУП «Нивы» (задолженность по судебному приказу № 49-14/2011 от 05.10.2011 г.)	Жлобинский район, Солонский с/с, ул. Советская, 29, комн. 409	28 227 311	90%	2 822 731	141 135	141 135
Лот № 4. КСУП «Нивы» (задолженность по судебному приказу № 49-14/2011 от 01.11.2011 г.)	Жлобинский район, Солонский с/с, ул. Советская, 29, комн. 409	28 227 311	90%	2 822 731	141 135	141 135

Заявления и прилагаемые к нему документы принимаются с момента опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, д. 5, комн. 1, с 9.00 до 17.00 в рабочие дни. **Прием документов заканчивается 31 января 2013 г. в 16.00.**

Задаток перечисляется до **31.01.2013 года** (включительно) на р/с 3012471008014 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, МФО 153001739, УНП 490492855.

Условия продажи – без условий.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа доли этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8 029) 621 22 36, 68 26 34.

ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов

№ п/п	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Наименование инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. руб.)	Расходы по документации
1.	д. Жиличи, участок № 1, кадастровый номер 623288005601000019	0,1772 га	Электроснабжение	8 737 000	1 751 300	3 367 251
2.	д. Жиличи, участок № 2, кадастровый номер 623288005601000020	0,1776 га	Электроснабжение	8 756 600	1 751 300	3 367 251
3.	д. Жиличи, участок № 3, кадастровый номер 623288005601000021	0,2131 га	Электроснабжение	10 507 000	2 101 400	3 367 251
4.	д. Жабичи, участок № 4, кадастровый № 623288005101000023	0,2500 га	Электроснабжение	18 787 500	3 757 500	3 367 251
5.	д. Жабичи, участок № 5, кадастровый № 623288005101000024	0,2500 га	Электроснабжение	18 787 500	3 757 500	3 367 251
6.	д. Карпиловка, участок № 8, кадастровый № 623288007101000031	0,2061 га	Электроснабжение	15 331 800	3 066 400	3 367 464
7.	д. Карпиловка, участок № 9, кадастровый № 623288007101000029	0,2330 га	Электроснабжение	17 333 000	3 466 600	3 367 464
8.	д. Карпиловка, участок № 9, кадастровый № 623288007101000029	0,1997 га	Электроснабжение	14 856 000	2 971 200	3 367 464

Задаток перечисляется на р/с 3600619171100 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк» МФО 153001601, УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. **Аукцион состоится 25.02.2013 г. в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, 36. Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 20.02.2013 г. до 17.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, 36.**

Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, 57 4 99.

■ Вандроўныя нататкі

Хованкі з Новай Мышшу

У мінулы раз мы апісвалі нашу вандроўку па Старой Мышы — да валоў былога замка Хадкевічаў, бровара, старажытнай алеі. Адтуль шлях наш пралягаў у Мыш Новую, што была адбудавана ў XVIII стагоддзі. Дарогу ад адной Мышы да другой раздзяляюць прасторныя палі ды старыя дамкі тыповай беларускай пабудовы — таксама ёсць на што паглядзець...

Будынак карчмы.

Новая Мыш, хутчэй за ўсё, была адбудавана пасля трынаццацігадовай вайны (XVII ст.) побач з кляштаром езуітаў, дзе з таго часу і знаходзіцца. У XVIII стагоддзі яна некалькі разоў мяняла гаспадароў: спачатку былі Масальскія, пасля — Несялоўскія. Пры Масальскіх тут пачала працаваць шкляная гута, налічвалася сто двароў, меліся касцёл, царква, шпіталь, школа, млын, карчма.

Будынак карчмы ці шынка (падаецца, для карчмы ён замалы) захаваўся і сёння. Гэта рэшткі двухпавярховага збудавання, якое некалькі гадоў таму было закансервавана — пастаўлены дах ды ўмацаваны сцены. Зараз у старым будынку з'явілася і некалькі новых акон, замацаваных мантажнай пенай: пэўна, хтосьці выкупіў былую карчму і збіраецца аднаўляць яе на свой лад.

Захаваўся і млын XIX стагоддзя. Аднак яго складана пазнаць: ён атынкаваны, на ім пастаўлены новы дах. Старое, нікому не патрэбнае збудаванне ператварылася ў сучасны катэдж. Так і атрымліваюцца сапраўдныя хованкі: адшукай, дзе гістарычная каштоўнасць, а дзе навабуд?

Ёсць у Новай Мышы і яўрэйскія могілкі, і нават рэшткі сінагогі; ёсць і могілкі хрысціянскія, з адмысловымі помнікамі і чырвонымі абеліскамі. Шмат пабудоў (напрыклад школа) былі зроблены ў польскі час — відаць, што на іх зараз таксама распачынаюцца работы прыватнікаў.

Як на напластаванні часу цікава паглядзець і на жылыя дамы, у сценах якіх чырвонай цэглай выкладзена «БССР 1950» або «1991» і побач чырвоны цагляны крыж. Акурат паміж старажытнымі касцёлам і царквой стаіць цагляная воданапорная вежа, таксама зробленая ў савецкі час.

Сваёй прыгажосцю вабіць касцёл Перамянення Пана, узведзены Сапегамі ў 1825 годзе на месцы згарэлага драўлянага 1641 года пабудовы. У куце перад касцёлам стаіць двух'ярусная званіца, што дзейнічае і зараз. Касцёл абнесены трохарачнай мураванай брамай, выкананай у неарускім стылі. Сам дом набажэнстваў зроблены ў стылі позняга класіцызму, пра што сведчаць пары здвоеных калон, порцік, франтон. Дарэчы, на франтоне месціцца ліхтар-званічка. Іграе ён дзякуючы спецыяльнаму механізму. Стрэльчатыя вокны касцёла пабудаваны пад уплывам псеўдаготыкі. У дварэ касцёла знаходзіцца магіла і помнік паэту Яну Чачоту, які паходзіў з гэтых мясцін.

Унутры касцёла — шмат драўляных упрыгажэнняў. Разныя алтары і амбон (узвышэнне ці балкон, з якога чытаецца пропаведзь у самы ўрачысты момант, меўся толькі ў каталікоў і ўніятаў) перанесены сюды з касцёла бенедыкцінак у Нясвіжы. Паміж калонамі таксама размешчана драўляная скульптура. На хорах устаноўлены арган з драўлянай разьбой у стылі ракако.

Царква Праабражэння Гасподняга, што пабудавана ў 1859 годзе, таксама вабіць тым, што з'яўляецца драўлянай. Аднак калі падысці бліжэй і прыгледзецца, захапленне крыху адступае. Верхняя частка завяршэння царквы абкладзена сайдынгам. Галоўныя дзверы дома малітвы — таксама пластыкавыя. Драўляная беларуская экзотыка атрымліваецца не зусім сапраўднай...

Аднак і царква, і касцёл, ды і ўся Новая Мыш вартыя таго, каб на іх паглядзець. Калі ўзгадаць і пра Старую Мыш, атрымаецца вандроўка праз чатыры стагоддзі: ад XVI стагоддзя, калі быў пабудаваны замак Хадкевічаў, да нашых дзён, калі старажытная архітэктура прыстасоўваецца да патрэб сучаснасці з дапамогай новых, не падобных на арыгінал матэрыялаў...

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

Царква Праабражэння Гасподняга.

ЧАМУ ВЫРАШЫЛІ ПАЕХАЦЬ:
✓ Паглядзець на драўляную царкву канца XIX стагоддзя

ЯК ДАБІРАЛІСЯ І Ў КОЛЬКІ АБЫШЛОСЯ:
✓ З Мінска да Баранавічаў на электрычцы — 8760 руб.
✓ З Баранавічаў да Новай Мышы на маршрутцы — 3110 руб.
✓ Назад тым жа маршрутам (зранку заязджалі яшчэ ў Старую Мыш).
✓ Увогуле — 23740 руб. (не ўлічваючы наведванне Старой Мышы).

Касцёл Перамянення Пана.

■ Народныя ўмельцы

ЧАРОЎНЫЯ БЁРДЫ

Святлана Адзінец пляце мужчынскі пояс пры дапамозе бёрдаў — старажытнай ткацкай прылады.

Жыхарка вёскі Закальное Святлана Адзінец нечакана адкрыла ў сабе талент ткаць паясы і вельмі моцна захапілася ідэяй адрадзіць у сваёй вёсцы гэтую даўнюю рукадзельную традыцыю. Мастак па прызванні, яна малюе тонкія лірычныя пейзажы, робіць і дакладныя рэпрадукцыі старых дываноў колішняга любанскага самадзейнага мастака Паўла Марціновіча. Але менавіта ткацтва паясоў прынесла ёй прызнанне як мастачцы. На Мінскім абласным свяце-конкурсе «Беларускі пояс» за вялікую калекцыю сваіх вырабаў Святлана атрымала Гран-пры. Засвоіўшы тэхналогію і тэхніку старажытнага ткацтва, ёй удаецца наблізіцца да ўзроўню даўніх майстроў, якія стваралі сапраўдныя шэдэўры. Але мала ўмець і рабіць самой — важна навучыць іншых, перадаць ім набытае майстэрства і прывіць сапраўдную любоў да справы. Толькі гэтым можна растлумачыць памкненне мастачкі Святланы Адзінец весці ў вясковым цэнтры культуры дзіцячыя гурткі «Спавівач», «Чароўная скрыначка» і аматарскае моладзевае аб'яднанне «Вясковыя прыгажуні» па стварэнні жаночага строю з элементамі ткацтва, вышыўкі і нават інкрустацыі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Любанскі раён

НАВАРЫЎ КАШЫ — МАСЛА НЕ ШКАДУЙ!

Кулінарная Энцыклапедыя Мікалая Ніфаровіцкага

А зараз, шаноўныя чытачы, дайшла чарга яшчэ да адной стравы, якая амаль кожны дзень была на сялянскім стале. Гэта каша. Нікіфароўскі піша: «Як вядома, каша з'яўляецца адной з любімых страў простага люду, народзе з блінамі і кісялём, аднак ад яе частага прыгатавання прыходзіцца ўтрымлівацца таму, што гэта патрабуе выдаткаў на замасліванне, што пацвярджаецца прымаўкай: «Наварыў кашы — масла не шкадуй!» Кашу любілі за прастату прыгатавання і высокія спажыўныя якасці: пад'еўшы раніцай кашы, можна было да абеду працаваць без пачуцця голаду.

На Віцебшчыне каша рэдка гатавалася «праз лыжку» (не вельмі густа). Звычайна, яна была такой густаты, што ў яе з цяжкасцю ўваходзіла лыжка. Нездарма ж казалі, што «густая каша дзяцей не разганяе». Кашы былі не вельмі разнастайнымі: грэцкія, ячменныя, аржаныя, бульбяныя, зрэдку — просавыя.

Нікіфароўскі прыводзіць сакрэт гаспадынь Віцебшчыны для прыгатавання добрай кашы: «Густата, распар і жаданы смак яе дасягаюцца наступнымі высілкамі: калі крупы крыху распарацца і на загушшай кашы ўтворыцца трывалая скарынка, гаршчок у печы пераварочваюць уверх дном. Так ён і стаіць да часу спажывання кашы, чаму папярэднічае адмочванне гаршчка халоднай вадой, каб каша свабодна адставала ад гаршэчных сценак».

Шаноўныя чытачы, а ці ведаеце вы як правільна есці кашу? Накладай ды еш? Можна і так. А можна па-іншаму. Пра цікавы варыянт яе спажывання прыгадвае Уладзімір Караткевіч: «Робяць у місцы з кашай «калодзеж», наліваюць туды падлівы з мясам і чэрпаюць па краях. «Калодзеж», ясна, шырыцца, і туды даліваюць і даліваюць, аж пакуль не зробіцца адна суцэльная «студня» з мяса. Тады яе дабіваюць лыжкамі і просяць яшчэ».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
вёска Тонеж Лельчыцкага раёна.

Пры добрым ураджаі гарбузоў на стале сялян Віцебшчыны на непрацяглы тэрмін з'яўлялася «гарбузовая каша». У адрозненне ад астатніх каш, якія запраўляліся сметанковым маслам, салам ці алеем, яна заўсёды была малочнай. Я не згодны з тым сцвярджэннем Нікіфароўскага, што гарбузовая каша была кароткай сезоннай стравай: гарбузы ў трысцене або істопцы добра захоўваюцца аж да вясны (абы не памерзлі), таму матуля гатавала такую кашу зімой — праўда, не вельмі часта. Але калі я паспрабаваў гарбузовую кашу ў сталым узросце, то асаблівага смаку не адчуў. Выснова: у дзяцінстве і ежа смачнейшая, і сонца ярчэйшае, і жыццё весялейшае...

А ці ведаеце вы, шаноўныя чытачы, якую страву нашы продкі называлі «бульбяной яечняй»? Не? Тады пачытайце і вазьміце да ўвагі. Вараную таўчоную бульбу запраўлялі малаком, разбівалі туды 4-5 яек, выкладвалі ў посуд сярэдняй велічыні і ставілі ў печ на «вольны дух» (калі дровы згарэлі, вуглі патухлі і юшка ў дымаходзе была заложана. — **Аўт.**) да атрымання апетытнай залацістай пенкі. Другі варыянт падобнай яечні быў тады, калі абабраную бульбу дробна наразалі, залівалі малаком з яйкамі і ставілі ў печ. Да стала «бульбяная яечня» падавалася з хлебам або без яго ў ліку «заедкавых» страў. Зараз у некаторых кулінарных кнігах падобная страва называецца «запяканкай з бульбы і яек», але зазначым, што для Віцебшчыны была характэрна назва «бульбяная яечня».

Замест грэцкай і ячменнай кашы, якая мела назву «дубовай», у некаторыя дні гатавалася «гу́шча» — каша, якая адрознівалася ад сваёй папярэдніцы толькі тым, што не мела жыжкі. У памінальныя дні яна іншы раз замяняла куццю. Варта прыгадаць, што слова «куцця» ў нашай мове мае некалькі значэнняў. Так называецца ўрачыстая вячэра напярэдадні Каляд, Новага года і Вадохрышча, а таксама абрадавая ежа.

Нікіфароўскі піша: «Спецыяльная «куцця» гатуецца з суцэльных зерняў пшаніцы ў памінальныя дні і на ўсе тры Каляды, якія таму і маюць яе назву: «першая» куцця, багатая, галодная. Прыгатаванне куцці, як і яе ўжыванне, абстаўлена мноствам прыкмет і прымхаў. Калі ёсць уласныя пчолы або сямейны дастатак дазваляе купіць мёду, куцця гатуецца з сытай (мёдам, разведзеным гатаванай вадой. — **Аўт.**). У іншым выпадку яна ўжываецца то са сметанковым маслам, то з алеем. Якой бы ні была куцця, яна падаецца да стала першай і заўсёды халоднай.

Пры адсутнасці патрэбных для прыгатавання куцці прадуктаў і пры паспешнасці прыгатавання стравы дробна наразаюцца абаранкі і ў такім выглядзе ўжываюцца ў сыце або цукровай вадзе. Такая «куцця» лічыцца горшай за пшанічную, але лепшай, чым «гушча».

Куцця, як абрадавая страва, прыйшла да нас з далёкіх язычніцкіх часоў. Слова «куцця» ў перакладзе з грэчаскай мовы азначае «бабы», «зерне». У маім родным Чашніцкім раёне Віцебскай вобласці рытуальнай стравай на памінках, Радаўніцы, Дзядах з'яўляецца рысавая каша (іншы раз з разынкамі), якой на пачатку памінальнай трапезы трэба з'есці тры лыжачкі. Яна таксама мае дахрысціянскае паходжанне і называецца «канун», але зараз мала хто памятае яе назву. Думаецца, што гэтыя рытуальныя стравы, як і просвіра, трапілі да нас праз Грэцыю, Рым і Візантыю, бо праваслаўная царква прыняла іх у свой службовы ўжытак.

Шэраг «страў», пра якія ўзгадаў наш славуты этнограф, заканчваецца «ласай кулагай». Яна гатавалася амаль з усіх ягад, нават з яблыкаў і груш, але часцей з тых ягад, якія не мелі буйных костачак: чарніц, «п'янікі» (буякоў, дурніц), брусніц, журавін. З вішань, сліў, чаромхі, каліны вымалі костачкі. Ягады варыліся разам з добрай мукой у закрытым посудзе да густаты кісялю. Калі дазвалялі сродкі, у «кулагу» дадавалі мёд ці цукар, тады апошнюю вымаквалі хлебам, сачнямі, блінамі. «Кулага» падавалася на заедкі і ў цёплым, і ў халодным выглядзе.

А зараз рэцэпт гарбузовай кашы. Нам спатрэбяцца: *1 кг мякаці гарбуза, 1 шклянка рысу, 1 шклянка проса, 100 г сметанковага масла, 2 яйкі, 0,75 л малака, соль, цукар.*

Гарбуз абіраем і наразаем мякаць кубікамі. Варым у каструлі з вадой да гатоўнасці. Ваду зліваем. Мякаць гарбуза з дапамогай таўкача або блендара размінаем у пюрэ. Кожную з круп варым паасобку да паўгатоўнасці. Змешваем мякаць гарбуза, рысавую і просавую кашы, разбіваем туды 2 яйкі, дадаём сметанковае масла, малако, соль і цукар на смак і старанна перамешваем. Выкладваем у гаршчок або чыгун, змазаны сметанковым маслам, і на паўтары гадзіны ставім у духоўку пры тэмпературы 180°. Як толькі каша зверху зарумяніцца — страва гатова. Яе можна ўжываць як у гарачым, так і халодным выглядзе, як з малаком, так і без яго.

Аляксандр ВАШЧАНКА.

Рэцэпт бульбяной бабкі ад нашай чытачкі Галіны Тоўпінец з Чашнікаў. Яна піша, што для прыгатавання бабкі трэба 10-12 буйных бульбін, 1-2 ст. л. мукі, 2 цыбуліны, 100 г сала з праразою або грудзінкі, соль. Спачатку на дробнай тарцы надзіраем адну цыбуліну (каб не пачарнела драннё), а потым — сырую абабраную бульбу. Дадаём муку, соль і перамешваем. Сала або грудзінку наразаем дробнымі кубікамі, падсмажваем на патэльні разам з цыбуляй, а потым змешваем з бульбай. Сценкі чыгунка (дарэчы, гэты посуд добра падыходзіць не толькі для печы, але і для духоўкі. А. В.) або гаршэчка змазваем тлушчам, выкладваем туды сумесь і ставім у духоўку на паўтары гадзіны пры тэмпературы 180° (накрываць не трэба). Чым больш сумесі ў посудзе, тым больш часу трэба на прыгатаванне. Гатовую бабку нажом аддзяляем ад сценак чыгунка і выкладваем на вялікую талерку. Ужываем у гарачым выглядзе са смятанай, а можна яшчэ бабку парэзаць на скібкі і падсмажыць на патэльні да атрымання залацістай скарынкі. Будзе смачна!

Міхаіл ФІНБЕРГ:

«МЫ АХОЎВАЕМ МУЗЫКУ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ»

У Заслаўі год пачынаецца са свята музыкі

Заслаўчане прывыклі, што год у іх пачынаецца не 1 студзеня, а тады, калі адбылося свята музыкі «Заслаўе». Тады можна, набраўшы поўныя лёгкія вольнага паветра, выдыхнуць і пачынаць новы год з чыстага аркуша.

Фота БЕЛТА.

Сёлета музычны фэст (адзін з 17, якія плануе зладзіць у 2013 годзе Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга) прайшоў у 13-ы раз і быў прысвечаны 100-годдзю народнага артыста Беларусі, выдатнага кампазітара Анатоля Багатырова. А таму цалкам лагічна, што гучала шмат яго музыкі і музыкі яго не менш выбітных вучняў: музыка з балета Яўгена Глебава «Маленькі прынц», вядомая на ўвесь свет; урывак «Начны горад» з балета Генрыха Вагнера «Пасля балю»; урывак з оперы Дзмітрыя Смольскага «Сівая легенда»; «Падаюць сняжынкі» Эдзі Тырманд і «Багародзіца дзева радуйся» Алега Хадоскі ў выкананні вакальнага ансамбля пад кіраўніцтвам Наталлі Міхайлавай.

— Будучы рэктарам Акадэміі музыкі і карыстаючыся ласкай самога Сталіна, Анатолю Багатырову ўдалося ўратаваць ад рэпрэсій усіх сваіх калег па навучальнай установе, — распавядае **вучаніца Эдзі Тырманд, прафесар, загадчык кафедры беларускай музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Вольга ДАДЗІЁМАВА.** — Усе вучні Анатоля Васільевіча — адукаваныя, неверагодна эрудзіраваныя і начытаныя людзі. Пакуль з імі размаўляеш, можна пачуць пра ўсё, пачынаючы ад паэзіі старажытных грэкаў да расповедаў пра жыццё сучасных кампазітараў.

Вядома, што і музыкі самога Багатырова, аўтара славутай оперы паводле «Дрыгвы» Якуба Коласа «У пушчах Палесся», у Заслаўі прагучала шмат: «Фантастычны танец» у выкананні ансамбля флейтыстаў аркестра Фінберга; «Люблю наш край» Міколы Равенскага на словы Канстанцыі Буйло ў апрацоўцы Багатырова і інш. Беларускі кампазітар родам з Віцебска, які некалі не паехаў вучыцца ў Санкт-Пецярбург, а выбраў Мінск і, магчыма, толькі дзякуючы гэтаму застаўся творцам, якога нам не патрэбна ні з кім «дзяліць», пісаў і оперы, і араторыі, і рамансы, і музыку для вальсаў. Адным словам, не грэбаваў ніякімі жанрамі і пакінуў пасля сябе цудоўную разнастайную спадчыну. Музыка Багатырова і яго вучняў і сёння гучыць надзвычай актуальна.

Разам са святам музыкі прайшоў і абласны конкурс маладых выканаўцаў дзіцячых школ мастацтваў «Заслаўскі сшытак». Па сутнасці, гэта адзіны ў вобласці дзіцячы конкурс, на якім юныя музыкі могуць прадэманстраваць свае здольнасці гульні на самых розных музычных інструментах. Сёлета конкурс спецыялізаваўся на струнных інструментах. Налета — гэта будуць духавыя. 9 дзяцей і 6 ансамбляў (усіх увогуле больш за 100 чалавек!) бралі ўдзел у конкурсе.

— Маладыя навучэнцы музычных школ Мінскай вобласці спаборнічалі ў выкананні твораў беларускіх аўтараў. Удзельнічалі нават падрыхтоўчыя групы музычных школ — то бок, зусім маленькія дзеткі. У першую чаргу ўсе яны паказалі сваё стаўленне да сваёй радзімы і культуры. Вялікую працу зрабілі педагогі музычных школ, якія паставіліся вельмі сур'ёзна да падрыхтоўкі дзяцей да конкурсу, — распавядае **народны артыст Беларусі, кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Міхаіл ФІНБЕРГ,** — Менавіта ў Заслаўі мы праводзім фестывалі, прысвечаныя славутым імёнам нашай роднай Бацькаўшчыны. У мінулым годзе быў канцэрт, прысвечаны творчасці Льва Абеліевіча, якога называюць «беларускім Шастаковічам». Некалькі гадоў таму мы ладзілі канцэрт Дзмітрыя Лукаса, музыка якога амаль знікла, таму што яе практычна ніхто не выконвае. Правялі канцэрты Пятра Падкавырава, Рыгора Пукста, Аляксея Туранкова і інш. На жаль, такія канцэрты больш нідзе не праходзяць. І наогул, беларускую класічную музыку вельмі цяжка дзе-небудзь пачуць: няма даступных шырокаму колу запісаў, канцэрты не запісвае тэлебачанне і радыё...

Фота БЕЛТА.

У межах музычнага фестывалю «Заслаўе-2013» прайшоў і эстрадны канцэрт, і канцэрт навучэнцаў музычных школ Заслаўя, Маладзечна, Лагойска, Слуцка, Барысава, Вілейкі, Дзяржынска, Лошніцы, Мар'інай Горкі, Дружненска, і нават адкрылася выстава жывапісу — кожнаму па патрэбах, як той казаў.

А Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, у складзе якога 9 калектываў, працуе тым часам ужо над новымі праграмамі. Сёлета ўпершыню пройдзе фестываль у Любані. І далей па гарадах Беларусі: Нясвіж, Маладзечна, Чысць...

Цудоўна, што ў нас ладзяцца свайго роду асветніцкія фэсты, якія дапамагаюць не забываць беларускае музычнае мастацтва. А некаму, магчыма, адкрываць яго ўпершыню. У тым, што фэсты праводзяцца ў невялікіх гарадах, ёсць свой «цымус». Але каб такія святы музыкі праходзілі больш жвава і плённа, магчыма, варта адпрацаваць адмысловую схему, па якой быў бы прадугледжаны, напрыклад, спецыяльны транспарт, што за невялікую плату падвозіў аматараў класічнай музыкі са сталіцы і іншых гарадоў у Заслаўе. І так па ўсіх 17 гарадах услед за аркестрам. Так, фестывалі будуць ахопліваць больш людзей. Адпаведна, мець большы рэзананс і значна большы «асветніцкі эфект». Галоўнае, каб высакародная задума не ператварылася ў «добраахвотны прымус», якім у нас часта любяць псаваць усе цікавыя пачынанні.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

■ Шматвектарная эканоміка

БЕЛАРУСЬ — ВЕНЕСУЭЛА: ЯК РУКОЙ ПАДАЦЬ

Нягледзячы на адлегласць, гэта краіна ўсё ў большай ступені робіцца нашым суседам

Усё большую колькасць грамадзян Беларусі цікавіць палітычная сітуацыя ў Венесуэле. Сярод іх не толькі палітыкі, эксперты і журналісты, але і сваякі камандзіраваных у паўднёва-амерыканскую краіну спецыялістаў, а таксама калектывы прадпрыемстваў, што экспартуюць за акіян свае тавары і паслугі. Генеральны дырэктар закрытага акцыянернага таварыства «Белзамежбуд» Віталь БАНДАРЫК і спецыяліст гэтай кампаніі па сувязях са сродкамі масавай інфармацыі Андрэй СМІРНОЎ расказалі «Звяздзе» пра свой погляд на супрацоўніцтва з Венесуэлай і яго перспектыву.

Уга Чавес сярод супрацоўнікаў ЗАТ «Белзамежбуд» падчас наведвання заводаў у штаце Барынас 21 лютага 2012 г. Фота Віталя Прышывалкі.

— Наколькі ў Венесуэле ўзаемазвязаны палітычная сітуацыя і тыя эканамічныя праекты, у якіх, у тым ліку, задзейнічана ваша прадпрыемства?

Віталь Бандарык: Сацыяльная палітыка ў Баліварыянскай Рэспубліцы Венесуэла ажыццяўляецца для электарату і не залежыць ад таго, якая ўлада ў дзяржаве і які ўклад. Ні Чавес, ні яго гіпатэтычны пераемнік не зацікаўленыя ў тым, каб згортваць праекты, якія арыентаваны на большасць насельніцтва. Усё, што мы робім у Венесуэле, мае сацыяльную накіраванасць. Мы ўдзельнічаем у ажыццяўленні агульнанацыянальных праграм «Вялікая місія жыллё», «Аграрная місія Венесуэлы», «Вялікая місія ведаў і працы», задачы якіх, па сутнасці, сфармуляваны ў саміх назвах.

— Якім чынам вы, знаходзячыся ў Беларусі, сочыце за падзеямі на поўначы Паўднёвай Амерыкі?

В.Б.: Кіраўніцтва кампаніі мае пастаянныя кантакты са службай, якая кантралюе сітуацыю ў краіне, праводзячы маніторынг інфармацыі са СМІ, а таксама адсочваючы ўсе афіцыйныя заявы розных палітычных колаў Венесуэлы.

— Якая там зараз сітуацыя?

В.Б.: Ёсць спробы нагнятання з боку апазіцыі. Парламент і Вярхоўны суд дазволілі перанесці інаўгурацыю прэзідэнта, якая першапачаткова планавалася на 10 студзеня. У сувязі з гэтым 12 студзеня апазіцыя вырашыла правесці акцыі пратэсту. Але ўрад апярэдзіў апазіцыянераў: у Каракасе адбыўся шматтысячны мітынг у падтрымку Чавеса. Тут, відаць, патрэбна тлумачэнне. Справа ў тым, што тры з пяці муніцыпалітэтаў Каракаса з'яўляюцца апазіцыйнымі. Самы ж вялікі муніцыпалітэт — Эль Лібертадор — прачавесаўскі, у ім пражывае больш за палову насельніцтва Каракаса. Вось таму цэнтр Каракаса ў гэтыя дні афарбаваўся ў чырвоны колер чавістаў, а не ў блакітны — колер апазіцыі.

Андрэй Смірноў: Каб разважаць пра ўплыў хваробы Чавеса на палітычную сітуацыю ў Венесуэле, трэба разумець маштаб яго асобы ў лацінаамерыканскім, сусветным і нават рэвалюцыйным кантэксце. Майкі з партрэтам Чавеса не менш папулярныя, як некалі — з малюнкам Чэ Гевары. Таксама трэба ўлічваць асаблівасці венесуэльскай дэмакратыі. На працягу 13 гадоў прэзідэнцтва Чавеса на яго жыццё рабіліся замахі, падчас мяцяжу 2002 года яго ўвогуле ўкралі і арыштавалі... Я ўжо не кажу пра публічную крытыку.

Яшчэ тры месяцы таму амаль у палове штатаў кіравалі губернатары з ліку апазіцыянераў. А гэта — контррэвалюцыйныя газеты, сайты і нават тэлеканалы. Апошнія губернатарскія выбары, 17 снежня 2012 года, расставілі кропкі над «і». Больш чым пераканаўчая перамога чавістаў аказалася нечаканай нават для іх саміх. Цяпер 20 з 23 штатаў Венесуэлы з'яўляюцца «чырвонымі», бо губернатары там — члены правячай партыі PSUV. Сакрэт перамогі — у дасягненнях урада за апошнія гады.

Бясплатныя медыцынскае абслугоўванне і адукацыя, абарона правоў працоўных і служачых. За апошнія два гады пабудавана 350 тысяч кватэр сацыяльнага жылля, узровень беспрацоўя знізіўся да 6%, па ўсёй краіне працуюць гандлёвыя пункты з таннымі таварамі першай неабходнасці і г.д.

Цяпер 20 з 23 штатаў Венесуэлы з'яўляюцца «чырвонымі», бо губернатары там — члены кіруючай партыі PSUV. Сакрэт перамогі — у дасягненнях урада за апошнія гады

Пасля перамогі чавістаў на губернатарскіх выбарах апазіцыя зразумела: накідвацца на хворага чалавека бесперспектыўна, асноўная маса нейтральных да палітыкі людзей па-хрысціянску спачувае кіраўніку краіны.

— Ці варта турбавацца сваякам тых беларусаў, якія працуюць у Венесуэле?

В. Б.: На кожным з аб'ектаў «Белзамежбуда» існуюць аддзелы службы бяспекі. Яны ўвесь час маніторацъ сацыяльную сітуацыю як у Венесуэле, так і ў населеных пунктах вакол аб'ектаў. 10 студзеня не працаваў толькі жаночы персанал у Каракасе, а прадпрыемствы за межамі сталіцы дзейнічалі ў звычайным штатным рэжыме. Мы распрацавалі мерапрыемствы на выпадак надзвычайных падзей, усе супрацоўнікі пра іх папярэджаны. На любы пазаштатны выпадак існуюць адпаведныя інструкцыі. Задача адміністрацый беларускіх будаўнічых аб'ектаў — гарантаваць бяспеку калектыву. Да таго ж усе яны з'яўляюцца закрытымі, знаходзяцца на агароджанай тэрыторыі, якая ахоўваецца, і досыць ізаляваны.

— Колькі зараз супрацоўнікаў таварыства «Белзамежбуд» працуе ў Венесуэле?

В.Б.: Цяпер каля 400 чалавек, але гэтая лічба ўвесь час мяняецца. На нашым прадпрыемстве працуе найбольшая колькасць беларусаў у Венесуэле.

— На які тэрмін разлічаны вашы праекты ў гэтай краіне?

В.Б.: Мы бесперапынна працуем над заключэннем новых кантрактаў, таму да 2016 года працаў сябе забяспечылі. У стадыі прапрацоўкі новыя пагадненні, і думаю, калі прэзідэнт цалкам уступіць у свае паўнамоцтвы, яны будуць канчаткова зацверджаны. Мы ўсе перажываем за Уга Чавеса і жадаем яму хуткага выздараўлення. Мала якія краіны праходзяць праз такія выпрабаванні.

А.С.: Што тычыцца далейшых беларуска-венесуэльскіх стасункаў, са свайго боку дадам пра пабудаваныя аб'екты. Напрыклад, на заводзе па вытворчасці трактароў «Беларус» у штаце Барынас працуюць усяго трое грамадзян Беларусі — механік, інжынер і перакладчыца. Крыху больш беларусаў удзельнічае ў зборцы МАЗаў. Але гэта не азначае зніжэння ўдзелу беларускага боку.

Па-першае, трактары і грузавікі там збіраюцца з машынакамплектаў, якія пастаўляюцца з Беларусі. Такое агульнакарыснае супрацоўніцтва наўрад ці можа быць прыпынена раптоўна.

Па-другое, у той жа індустрыяльнай зоне Санта Інэс працягваецца будаўніцтва завода па выпуску дарожнабудаўнічай тэхнікі «Амкадор». І хаця ў сакавіку плануецца завяршэнне будаўніцтва, каля сотні беларусаў без працы не застануцца: яны пераключацца на будаўніцтва двух пасёлкаў для венесуэльскіх рабочых. Агульная колькасць кватэр — каля 2000.

Набірае абароты здадзены «Белзамежбудам» завод па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у штаце Міранда. Восенню мінулага года быў падпісаны Канчатковы акт выкананых работ. На той момант колькасць вырабленай беларуска-венесуэльскім сумесным прадпрыемствам прадукцыі склала больш за 7 млн адзінак. Гутарка ідзе толькі пра першую лінію, якая вырабляе керамічныя блокі двух відаў. Калі ўрад Венесуэлы пачне фінансаванне будаўніцтва другой лініі, то завод будзе вырабляць яшчэ і табелоны — спецыяльныя пліты для перакрыццяў. Дарэчы, венесуэльскае міністэрства будаўніцтва калісьці выказвала жаданне мець як мінімум яшчэ 6 такіх заводаў.

Ёсць яшчэ аграгарадок Ла Раана, на палетках якога працуюць лідскія камбайны і мінскія энергаёмістыя трактары... Там да двухсот нашых будаўнікоў узводзяць 500 сядзіб, працоўную і сацыяльную інфраструктуру, там нашы аграномы сеюць і збіраюць ураджаі маісу і сорга... Зараз будуецца адзін аграгарадок, у планах — пяць. Пералік можна доўжыць.

— У якіх умовах, дарэчы, жывуць беларусы ў Венесуэле?

А.С.: Умовы камфорту адрозніваюцца ў залежнасці ад аддаленасці ад Каракаса. У Сан-Хуане здараюцца перабоі з пастаўкай вады або веерныя адключэнні святла. У раўнінных Барынасе і Маракаі спякота пераносіцца больш цяжка, чым, напрыклад, у гарыстым Каракасе. Самыя сціплыя ўмовы ў тых беларусаў, што будуюць аграгарадок у штаце Гуарыка. Але там сціпласць умоў кампенсуецца больш душэўным стаўленнем мясцовага насельніцтва, а таксама таннасцю грамадскага харчавання і паслуг, пры тым, што заробкі ў Каракасе і правінцыі ў беларусаў аднолькавыя.

Яшчэ тры гады таму навічкі з Беларусі не ведалі, як карыстацца тамтэйшай электраразеткай, а цяпер яны распавядуць пра флору і фаўну Венесуэлы больш за беларускага навукоўца. Двое нашых хлопцаў у штаце Барынас у вольны ад працы час кракадзілаў гадуюць...

Нашы спецыялісты і рабочыя жывуць у шматпавярховых, у арандаваных кватэрах па 3-4 чалавекі альбо ў дамах тыпу катэджаў па 5-7 чалавек. У кожнага свой асабісты пакой з санвузлом, гатуюць на агульнай прасторнай кухні. У некаторых ёсць нават басейны і невялічкія паркі ў дворыку.

— Як мясцовае насельніцтва ставіцца да беларусаў? Ці лёгка нашым людзям прызвычаіцца да паўднёваамерыканскай спецыфікі?

В.Б. Вельмі добра ставіцца. Беларусы хутка засвойваюць іспанскую мову і лёгка камунікуюць з венесуэльцамі. Праблем у стасунках няма.

А.С.: Яшчэ тры гады таму навічкі з Беларусі не ведалі, як карыстацца тамтэйшай электраразеткай, а цяпер яны распавядуць пра флору і фаўну Венесуэлы больш за беларускага навукоўца. Двое нашых хлопцаў у штаце Барынас у вольны ад працы час гадуюць... кракадзілаў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

■ Крымінал

А ЗА ПРЫПІСКІ АДКАЖАЦЕ!

У Оршы супрацоўнікамі міліцыі была раскрыта цэлая схема прыпісак, якімі займалася службовая асоба адкрытага акцыянернага таварыства.

Высветлілася, што ў 2010 годзе з мэтай выканання паказчыкаў па тэмпах росту аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі, гэты чалавек арганізаваў фармальную, узаемную пастаўку прадукцыі з іншымі прадпрыемствамі вобласці без яе фактычнай прыёмкі на прадпрыемстве.

У выніку за май—снежань былі ажыццёўлены прыпіскі да аб'ёму вытворчасці ААТ на суму 20,2 млрд рублёў —19,8 працэнта ад аб'ёму ўсёй выраблёнай камбінатам за 2010 год прадукцыі. Пры гэтым былі дапушчаны неабгрунтаваныя транспартныя выдаткі па дастаўцы і адгрузцы прадукцыі на суму звыш 234 мільёнаў рублёў. Таксама неабгрунтавана зроблены грашовыя выплаты стымулюючага характару і павялічана заработная плата за фіктыўна выкананыя паказчыкі на агульную суму каля 279 мільёнаў рублёў.

Прадпрыемству быў нанесены матэрыяльны ўрон на агульную суму больш як 500 мільёнаў рублёў.

У дачыненні да службовай асобы ААТ супрацоўнікамі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі была распачата крымінальная справа па адпаведным артыкуле Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае адказнасць за злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі. Справа расследуецца Следчым камітэтам Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

■ Як нас дураць...

ЮНАК ПРАСІЎ ДАПАМАГЧЫ...

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Фрунзенскага РУУС сталіцы затрымалі 18-гадовага мінчаніна, які падазраецца ў серыі махлярстваў. У міліцыю з заявамі ўжо звярнулася паўсотні пацярпелых, аднак сам затрыманы сцвярджае, што колькасць яго ахвяр нашмат большая.

Сваю незаконную дзейнасць малады чалавек распачаў у маі мінулага года. Ідэю «падкінуў» адзін са старэйшых таварышаў. Сваіх шматлікіх знаёмых, а затым і знаёмых знаёмых, мінчанін угаварваў дапамагчы набыць у растэрміноўку лічбавую тэхніку. Пры заключэнні здзелкі сам аплачваў першы ўзнос, даваў памочніку невялікае ўзнагароджанне за паслугу ў суме 100-200 тысяч рублёў, а таксама запэўніваў, што наступныя ўзносы будзе спраўна пагашаць... Набытая ж тэхніка практычна адразу збывалася на сталічных рынках па цэнах удвая ніжэйшых за рэальныя. У дачыненні да затрыманага заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества СООО «Барпромэкс»

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена лота (руб.)	Задаток 5% на первый лот, 10% на остальные лоты (руб.)
1	2	3	4
1	Трехэтажное кирпичное здание цеха № 22 инв. № 310/с-14880, общей площадью 2502 кв. м, год постройки 1985 г. – 3 008 311 800 рублей Здание механизированного склада металла инв. № 350/С-76751, общей площадью 378,8 кв. м, год постройки 1985 г. – 340 749 000 рублей Пилорама инв. № 310/С-27623, общей площадью 180,4 кв. м, год постройки 2004 г. – 154 108 200 рублей Пилорама инв. № 350/С-75609, общей площадью 154,2 кв. м, год постройки 1996 г. –154 258 200 рублей Открытая площадка лесосклада площадью 2069,6 кв. м, год постройки н/у – 76 372 200 рублей Здание склада СТАС № 350/С-76752, общей площадью 912,2 кв. м, год постройки н/у – 872 232 000 рублей Складские помещения инв. № 310/С-27624, общей площадью 613,9 кв. м, год постройки 2004 г. – 563 964 600 рублей Асфальтовое покрытие площадью 1658,7 кв. м, год постройки н/у – 61 679 400 рублей Ворота металлические с 2-мя мех открывания ворот – 17,5 кв.м – 2 982 600 рублей Ворота металлические с 2-мя мех открывания ворот – 21,0 кв.м – 3 513 600 рублей Ограждение из ж/б плит (47 шт.) площадью 1054,4 кв.м – 50 275 200 рублей ЛЭП ААБС – 400,0 м – 3 033 600 рублей Пункт распределительный инв. № 215 – 231 600 рублей Пункт распределительный ПР 24 инв. № 213 – 354 000 рублей Пункт распределительный ПР 24 инв. № 214 – 354 000 рублей Пункт распределительный ПР 9522 инв. № 216 – 304 200 рублей Пункт распределительный ПР 9000 инв. № 10631 – 1 980 000 рублей Пункт распределительный ПР 9000 инв. № 10138 – 1 980 000 рублей Пункт распределительный ПР 9000 инв. № 10137 – 2 100 000 рублей Конденсаторная установка БСК – 240 квар. инв. № 10669 – 5 640 000 рублей Станок отрезной инв. № 1/01 –1 980 000 рублей Станок отрезной инв. № 1/02 – 3 300 000 рублей Станок отрезной инв. № 1/12 – 18 600 000 рублей Станок отрезной инв. № 1/13 – 1/18 (6 шт.) – общая стоимость – 11 700 000рублей Станок фрезерный для фрезерования отверстий инв. № 1/24 – 1/33 (10 шт.) – общая стоимость – 35 940 000 рублей Стеллаж для хранения пиломатериалов инв. № 217 – 243 (27 шт.) – общая стоимость – 20 940 000 рублей Транспортер ленточный инв. № 1/19 – 1/23 (5 шт.) – общая стоимость – 23 220 000 рублей Трансформаторная подстанция КТП 1000V инв. № 10258 – 17 160 000 рублей Станок сверлильно-клеймовый инв. № 1/34 – 22 980 000 рублей Линия по производству кабельных барабанов инв. № 1 – 605 460 000 рублей Станок многопильный GABBIANI SA350 инв. № 1/03 – 24 540 000 рублей Зигмашина ИВ 2714 инв. № 15 – 20 580 000 рублей Котел отопительный КВ 80 инв. № 4 – 5 460 000 рублей Котел отопительный КВ 80 инв. № 4.1 –5 340 000 рублей Циклон с бункером ОЭ КДМ инв. № 211 – 8 880 000 рублей Электроталь 2 т инв. № 209 – 4 140 000 рублей Электротельфер 2 т инв. № 210 – 3 000 000 рублей Стружкоотсос с пылеулавливателем инв. № 1/04 – 410 400 рублей Кран козловой КК-К-20А инв. № 212 – 154 560 000 рублей Бункер для сбора отходов древесины инв. № 64-001 – 3 900 000 рублей Бункер циклон ограждения инв. № 6Н-3 – 8 880 000 рублей Циклон вытяжки с виброопорами инв. № 2-25 – 8 880 000 рублей Циклон с бункером инв. № 64-023 – 8 880 000 рублей Циклон с реперами и стропами инв. № 22-64 – 8 880 000 рублей Электроталь 1т инв. № 1109 – 3 720 000 рублей Электроталь 1т инв. № 53 – 3 720 000 рублей Кран-балка 1т инв. № 1787 – 14 640 000 рублей Кран-балка 2т инв. № 1804 –16 260 000 рублей Кран-балка 3,2т инв. № 1217 – 18 060 000 рублей Кран-балка 3,2т инв. № 2105 – 18 060 000 рублей Электросчетчик ЦЭ 6850М инв. № 5 – 900 000 рублей Электронный измеритель влажности МГ 4Д инв. № 2909 – 2 040 000 рублей Сушильный комплекс TERMOLEGNO CSD-50 – 275 141 672 рублей Трансформатор ТМЗ 1000/10-72У1 инв. № 11019 – 16 980 000 рублей Трансформатор тока ТОЛ -10-1-2-0,5S/10Р-150/5 инв. № 11020-11022 (3 шт.) – общая стоимость – 1 980 000 рублей Щепкодробильная установка инв. № 1/07 – 30 360 000 рублей Пилорама РК 3217 (линия по распиловке древесины) инв. № 2809 – 41 280 000 рублей Станок заточной инв. № 1/05 – 5 340 000 рублей Станок заточной инв. № 1/06 – 5 340 000 рублей Станок ленточный 1/09-1/11 (3 шт.) – общая стоимость – 28 080 000 рублей Гидравлический пресс гибки барабанов инв. № 1/08 – 420 000 рублей Компрессор инв. № 1/35-1/36 (2 шт.) – общая стоимость – 2 640 000 рублей Штамп 00-001 Фланец – 300 000 рублей Штамп 00-002 Фланец – 300 000 рублей Тележка трековая (линия по распиловке древесины) инв. № 205-208 (4 шт.) – общая стоимость –1 680 000 рублей Окорочный станок с расклинивающими ножами и подающий транспортер (линия по распиловке древесины) – 58 980 000 рублей Рольганг (7 п.м.) инв. № 2/02 – 8 640 000 рублей	6 886 896 272	344 344 814
2	Прицеп ПСЕ-Ф – 12,5	4 380 000	438 000
3	Пневмогвоздобой С33/90-А-2	2 760 000	276 000
4	Пневмопистолет ПП – 8/45	360 000	36 000
5	Пневмопистолет ПП – 8/45	420 000	42 000
6	Пресс Кд-2322	19 800 000	1 980 000
7	Станок токарно-винтовой МК 60-56	25 800 000	2 580 000

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5, тел. моб. (8029) 621-22-36.

Продавец: СООО «Барпромэкс», г. Гомель, ул. Объездная, д. 9, к. 7.

Задаток перечисляется **до 18 февраля 2013 г**. (включительно), на р/с 3012132179001 в ОАО «Банк БелВЭБ» ГРО № 530 г. Минск, МФО 153001226, УНП 490317170.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления до 16.00 18 февраля 2013 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Дата, время, место проведения открытого аукциона: 20 февраля 2013 года в 12.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам:
(8-029) 621-22-36, (8-029) 684-94-62 или тел./факс 8-0232-68-25-50.

Дополнительная информация: www.disponent.by

СООО «Росгосстрах» **просит считать недействительным** страховые полисы РГСнв №№ 0000247, 0000264, 0000314, 0000315, 0000316 по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней во время поездки за границу в связи с утерей.

УНП 806000260

ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске информирует о признании недействительными:
- страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездок за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0515042-0515045.

УНП 100706519

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона 26 февраля 2013 года по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Лыщицком сельском Совете Брестского района

№ п/п	Местоположение земельного участка	Площадь, га	Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб.	Целевое назначение земельного участка и его кадастровый номер
1	**Брестская область, Брестский район, аг. Остромечево, ул. Калиновая, 3**	0,1500	9 082 800	Строительство и обслуживание одноквартирного (блокированного) жилого дома, кадастровый номер 121282005601000557
	сумма задатка, руб.		908 280	
	расходы на изготовление земельно-кадастровой документации, руб.		4 154 623	
	расходы на объявление в средствах массовой информации, руб.		согласно акта выполненных работ	

Земельный участок расположен на расстоянии 15 км от черты г. Бреста в аг. Остромечево по ул. Калиновой, 3.

Не имеет ограничений в использовании земельного участка.

Подъезд к земельному участку обеспечивается по существующей уличной сети аг. Остромечево.

Земельный участок сформирован в квартале индивидуальной застройки аг. Остромечево.

Плодородный слой почвы необходимо снять из-под пятна застройки и использовать для благоустройства застройки.

Аукцион будет проводиться **26.02.2013 г. в 10.00** по адресу: Брестский район, д. Новые Лыщицы, ул. Юбилейная, д. 6а (здание сельисполкома). Для проведения аукциона необходимо наличие не менее двух участников.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копии платёжного поручения, подтверждающего внесение на расчётный счёт Лыщицкого сельисполкома № 3641000000233 в филиале № 100 Брестского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 150501246, УНП 200036604, назначение платежа 04901 в виде залога в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт, вид на жительство иностранного гражданина), подтверждающий личность покупателя.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский район, д. Новые Лыщицы, ул. Юбилейная, д. 6а (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений — **20 февраля 2013 года.**

Контактные телефоны: 95 31 50, 95 31 55, 95 31 53, 95 31 56, 95 31 57.

ИНФОРМАЦИЯ
о проведении повторного аукциона без условий по продаже недвижимого имущества

Адрес объекта и его наименование	- здание склада вторсырья, общей площадью 809,6 м² с инвентарным № 630/С-66746. Начальная стоимость **409 280 000 рублей** с учетом НДС 20%, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, д. Красное, ул. Станционная, 32А. - здание весовой, общей площадью 107,7 м² с инвентарным № 630/С-66784. Начальная стоимость **97 760 000** рублей с учетом НДС 20%, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, д. Красное, ул. Станционная, 32Б. Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. Объекты продаются одним лотом.
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 15 календарных дней на р/с Продавца с момента заключения договора купли-продажи, который будет заключен с Победителем в течение 15 календарных дней после проведения аукциона
Сумма задатка	**10%** от начальной цены – **50 704 000 рублей** на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: Коммунальное Строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс»
Продавец	**Молодечненское РАЙПО** г. Молодечно, ул. Молодежная, 12, тел.: 8(0176) 739111, 730309
Организатор аукциона	**Коммунальное Строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс»** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность
Информация по земельному участку	Объект № 630/С-66746 находится на земельном участке площадью 0,5372 га с кадастровым номером 623881706101000844, расположенного по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, д. Красное, ул. Станционная, 32А, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания склада вторсырья; Объект № 630/С-66784 находится на земельном участке площадью 0,0805 га с кадастровым номером 623881706101000844, расположенного по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, д. Красное, ул. Станционная, 32Б назначение – земельный участок для содержания и обслуживания здания весовой;
Конечный срок и адрес приема заявок	**18.02.2013 до 16⁰⁰,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, Коммунальное Строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс», тел.: (8 0176) 73 00 13, 75 16 09; (факс) 75 19 20; 8 044 710 74 60
Дата, время и место проведения аукциона	**22.02.2013 в 15⁰⁰,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, Коммунальное Строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс»
Условия проведения аукциона	Продавец имеет право отказаться от проведения аукциона не позднее чем за три дня до даты его проведения.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)

извещает о проведении 08 февраля 2013 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта	Продавец	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Срок подачи документов для участия в аукционе
1	Здание очистных сооружений инв. № 350/С-135550, общей площадью 159,3 кв.м	г. Гомель, ул. Интернациональная, д. 49	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Центрального района г. Гомеля.	1 205 615 145	10 000 000	по 07.02.2013 г. включительно в рабочие дни пн–чт с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в пятницу

Шаг аукциона – 5%. К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Победитель торгов обязан: подписать протокол о результатах аукционных торгов; согласно счету-фактуре, выписанному организатором аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, оплата которого осуществляется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок. **Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет р/с № 3012209370018 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление, код 912, ОКПО 02975763, УНП 400071204.**

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 18 78, 74 59 73 и на сайте gomeloblreklama.by

Подробная информация опубликована в газете «Звязда» за 10.11.2012 г.

■ За кадрам

Новай «Віа Гра» ў Беларусі хацелі стаць 300 дзяўчат

Адны адмаўляліся адказваць на «інтымныя» пытанні, а другія былі гатовы распрануцца «да нічога»

Апошні з чатырох папярэдніх кастынгаў тэлешоу «Хачу ў Віа Гру» прайшоў у мінулую пятніцу ў Мінску. Вобразы новых салістак знакамітага сэксуальнага трыа прымералі на сябе каля 300 дзяўчат — прычым сярод іх былі не толькі беларускі, але і ўкраінкі, і расіянкі. Як гэта адбывалася, разведвалі карэспандэнты «Звязды».

НА «ШПІЛЬКАХ» ДА ПОСПЕХУ

...У другой палове дня ажыятажу ў Нацыянальнай школе прыгажосці, дзе адбываўся прагляд, не назіралася. Нетаропка запаўняюць анкеты і атрымліваюць нумары (спачатку фотасесія, потым — інтэрв'ю ў рэдактараў праекта) або на канапках чакаюць сваёй чаргі ўсяго пара дзясяткаў дзяўчат, няўлюўна падобных паміж сабой — амаль усе высокія, доўгавалосыя, з «выклікам» апранутыя (ці лепш сказаць — смела распранутыя?) і на высачэзных «шпільках». Яшчэ некалькі чалавек сумуюць у «зале чакання», дзе прэтэндэнткі могуць пераапрануцца.

— Што значыць «дзе ўсе»? Гэта вы раніцай нічога не бачылі! — тэлевізіёншчыкі распавядаюць, што вялізная чарга пад дзвярыма сабралася яшчэ а восьмай раніцы. — Гэта цяпер засталіся дзяўчаты ўсё больш мадэльнай знешнасці, а былі і нефарматныя: і поўненькія, і вельмі худыя, маленькага росту — але з такімі галасамі, што заслухаешся... Некалькі ўкраінак было. Іншагароднія прыязджалі з чамаданамі проста з цягнікоў.

Лаўлю краем вуха ўрывак размовы чарговай кандыдаткі з рэдактарам:

— У анкеце ўказана, што ў вас ёсць муж, дзіця. Што ж вы сабраліся ў «ВІА Гру»?

— Былым салісткам наяўнасць дзяцей не перашкаджала спяваць у гурце! — смела парыравала дзяўчына.

— Вы гатовы, калі спатрэбіцца, надоўга расстацца з сям'ёй дзеля ўдзелу ў праекце?

— Без пытанняў!

Праспяваўшы — здаецца, ужо чыста фармальна — куплет хіта «ВІА Гры» «Спроба нумар 5», удзельніца атрымала допуск на наступны этап адбору.

Дарэчы, украінскія рэдактары шоу адзначылі, што якраз гэтая песня, таксама, як «Лепшыя сябры дзяўчат — гэта брыльянты», была лідарам па колькасці выкананняў. «Беларускі выбіраюць найчасцей павольныя і сумныя кампазіцыі, — падзялілася назіраннямі рэдактар кастынгу Яна Мазана. — Ад пятай па ліку «Купалінкі» мне плакаць хацелася, даводзілася ледзь не гвалтам выцягваць штосьці больш вясёлае і рытмічнае».

— Вы такую яркую бялізну апранулі — наўмысна, каб яе эфектна зняць? — пракаментавалі рэдактары больш чым смелае дэкальтэ яшчэ адной удзельніцы.

— Калі трэба будзе — здыму! — запэўніла тая.

— Як жа ваш хлопец, не будзе супраць? — падначылі тэлевізіёншчыкі.

— Ды дзе ён? — дэманстратыўна развяла рукамі дзяўчына, пасля чаго яе пабяцалі не толькі ўважліва праслухаць, але і сасватаць, калі спатрэбіцца.

— А вы ў нас ужо былі, — пазнаў адну з прэтэндэнтак іншы рэдактар. — Мяркуеце, мы забыліся, якія пытанні вам задавалі?

— Не, проста ў першы раз я была вельмі стомленая і праявіла сябе не так добра, як магла б, — не разгубілася дзяўчына. — Вырашыла паспрабаваць зноў.

«А ВЫ НАКЦЮРН СЫГРАЦЬ ЗМАГЛІ Б?»

Для тых, чые вакальныя здольнасці і матывы трапіць у «ВІА Гру» не пераканалі рэдактараў, кастынг на гэтым і завяршаўся. Зрэшты, трагедыю і слёзы ў вачах на гэты конт мы ўбачылі літаральна ў адной дзяўчыны. Астатнія жадалі ўдачы цяпер ужо былым канкурэнткам і спакойна развіталіся.

Амаль палове ўдзельніц — 150 чалавекам — пашанцавала трапіць у другі этап адбору: фотасесія і гутарка з псіхолагамі. Як высветлілася, менавіта тут дзяўчат і чакалі галоўныя выпрабаванні.

«Яны такія інтымныя пытанні задаюць, — са стрыманым абурэннем перагаворваліся дзяўчаты. — «Ці гатовы вы распасць з прадзюсарам?» «Можаце паказаць грудзі?» Гэта ўвогуле кастынг у гурт, ці што?».

— Я лічу, ніякага дачынення такія пытанні да гурта не маюць, — ашаламіла псіхолага 24-гадовая Ала Катлярова з Мурманска.

— Вы ўпэўнены ў гэтым? — зацікавіўся суразмоўца.

— Безумоўна. Дый крытэрыі адбору — любая камплекцыя, любы ўзрост... Калі б я адбірала ў «ВІА Гру», гэта было б жорстка — і знешнасць, і вакал.

Праўда, ацаніць уласную знешнасць, што аб ёй кажуць людзі, і назваць плюсы ды мінусы свайго характару дзяўчына як след так і не здолела, нягледзячы на ўсе намаганні псіхолага.

— А ў мяне нічога пошлага не запытваліся, — падзялілася пасля інтэрв'ю студэнтка сталічнай Акадэміі мастацтваў Святлана. — І распранацца не прасілі. Спыталіся толькі пра дзяцінства, сям'ю і пра тое, з кім я сябе ідэнтыфікую ў «ВІА Гры». Па адчуваннях гэта нагадвала прыёмную камісію, для якой ты ўжо двухсоты: «Ну, што ты нам яшчэ раскажаш, дзяўчынка?».

Насамрэч цнатлівыя спрачальніцы не мелі рацыі: рэдактары адбіралі ўдзельніц зусім не ў гурт, а ў тэлевізійнае шоу «Хачу ў ВІА Гру». Адпаведна, і шукалі яны не толькі галасістых ды фігурыстых дзяўчат, а яшчэ і тых, хто ўмее сябе падаць, хто не толькі марыць, але і ўяўляе, як дасягнуць сваёй мэты. Таму пытанні падчас гутаркі (дарэчы, яна праходзіла ў 4 асобных пакойчыках) гучалі зусім розныя: адных прасілі распрануцца, а другіх — распавесці, ці здольныя яны пайсці па галовах на конкурсе; адных распытвалі пра падарункі ад каханых, другіх — пра самыя непрыемныя моманты ў жыцці альбо самыя яскравыя ўспаміны дзяцінства. Дый доўжыліся гэтыя інтэрв'ю ў кожнага парознаму: ад 5 хвілін да паўгадзіны.

Зрэшты, нікому са 150 выбраных удзельніц не сказалі «Дзякуй, вы нам не падыходзіце» альбо «Сардэчна запрашаем на шоу» — канчатковае рашэнне прымуць прадзюсары ў Кіеве пасля прагляду фота- і відэаматэрыялаў. У лютым каля 50-60 чалавек будзе запрошана на дадатковы кастынг ва ўкраінскай сталіцы.

ПОГЛЯД ПАБОЧНАГА НАЗІРАЛЬНІКА

— Ат, што ж мы не падрыхтаваліся, трэба было таксама заявіцца, як удзельніцы кастынгу! — перажывала наш фатограф. — У мяне і голас ёсць, а вось правільна апрануцца не здагадалася...

— У чым справа — здымай світар, апранай камізэльку на голае цела, будзе самае тое, — жартавалі калегі з іншых выданняў. — А туфлі на абцасах у каго-небудзь з удзельніц папросім.

Паказаць майстэрства вакалу і танца, зачараваць усмешкай — гэта ўсяго толькі некалькі граняў таленту, якія можна было раскрыць на кастынгу.

Наша Марына ўсміхалася, падпявала кандыдаткам, але сама ў іх шэрагі запісацца так і не асмелілася. Тым больш, назіраць было значна цікавей. Многія прыйшлі на кастынг «проста так», «пабалавацца» альбо «чаму б не паспрабаваць», не ўяўляючы, што будуць рабіць, калі сапраўды пройдуць далей. Некаторыя відавочна блыталі кастынг: хто — з мадэльным дэфіле, хто — з конкурсам самадзейных талентаў... А галоўнае, ці не палова дзяўчат глядзела на рэдактараў падазрона і зацяснута, як той стойкі юнак-падпольшчык на допыце, абсалютна не жадаючы раскрывацца хоць на слова больш, чым напісана ў анкеце.

Тым не менш, украінскія рэдактары адзначылі, што беларускі «вельмі прыгожыя і добра спяваюць». Амаль палова ад агульнай колькасці кандыдатак прайшла першы адбор — гэта выдатны вынік у параўнанні з той жа Масквой, дзе з 2000 удзельніц адабралі ўсяго каля 200.

ГЕАМЕТРЫЧНАЯ ПРАГРЭСІЯ НААДВАРОТ

У тэлепраект трапяць 150 чалавек з чатырох краін, дзе праходзілі кастынгі, — Расіі, Украіны, Казахстана і Беларусі. Уласна, 3 першыя выпускі шоу распавядуць менавіта пра кастынгі. Падчас чацвёртага шоу колькасць прэтэндэнтак скароціцца ўдвая, а 75 найлепшым давядзецца штотыдня пацвярджаць свой «прагрэс», талент і волю да перамогі. «Да выніковай, 8-й праграмы дойдуць толькі 6 удзельніц, — кажа лінейны прадзюсар тэлеканала АНТ Міхаіл Бычанок, — з якіх 3 чалавекі стануць салісткамі абноўленага «народнага» гурта. Вялікі суперфінал праекта здымуць у Маскве».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Пасля ўдалага праходжання першага этапу дзяўчаты запаўнялі дадатковую анкету...

...і фатаграфаваліся з парадкавым нумарам.

■ Факт

ДВАНАЦЦАЦЬ ЖЫХАРАК БЕЛАРУСІ ПЕРАСЯГНУЛІ 110-ГАДОВЫ РУБЕЖ

Стагадовы рубеж перасягнулі 562 жыхары Беларусі, паведаміла БЕЛТА начальнік аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана Ермаковіч.

Паводле слоў субяседніцы, сярод беларускіх доўгажыхароў традыцыйна лідзіруюць жанчыны. Паводле звестак на 1 студзеня гэтага года, 100-гадовую планку перасягнулі 489 жанчын і 73 мужчыны. Такім чынам, прадстаўніцы слабага пола лідзіруюць амаль з сямікратнай перавагай. А ва ўзроставай катэгорыі старэйшых за 110 гадоў — наогул толькі адны жанчыны. Іх 12 чалавек.

Традыцыйна сярод рэгіёнаў рэспублікі флагманам па колькасці доўгажыхароў з'яўляецца Гродзенская вобласць: тут на 1 студзеня гэтага года налічвалася 111 чалавек, якім больш за 100 гадоў. На другую пазіцыю геранталагічнага рэйтынгу выйшла Брэсцкая вобласць (100), на трэцюю — Мінская вобласць (94). У Віцебскай вобласці пражываюць 85 чалавек, якія ўжо адзначылі свой векавы юбілей, у Гомельскай вобласці — 71, у Мінску — 52, у Магілёўскай вобласці — 49.

НОВАЯ ЗАПРАЎКА КАЛЯ ПУШЧЫ

У Камянецкім раёне адкрыта новая заправачная станцыя. Як паведамляе афіцыйны сайт райвыканкама, АГЗС пачала працаваць ля скрыжавання аўтадарог, што вядуць у Белавежскую пушчу і горад Высокае цераз Вярховічы.

Будаўніцтва запраўкі абышлося ў 7,4 мільярда рублёў. Працуе яна кругласутачна і без выхадных. Тут жа прадаюцца традыцыйныя для такіх пунктаў тавары — аўтамабільнае масла, тэхнічныя вадкасці, запчасткі да газавага абсталявання.

Яна СВЕТАВА

Даты | Падзеі | Людзі

1906 год — нарадзіўся Андрэй Александровіч, беларускі паэт, празаік, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1936). Адзін з арганізатараў літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У 1929-1931 гадах быў намеснікам дырэктара Белдзяржкіно, з 1932 года — намеснік старшыні аргкамітэта, а затым намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У 1938 г. арыштаваны і асуджаны. Рэабілітаваны ў 1955 г. У сваёй творчасці апяваў рэвалюцыйнае пераўтварэнне жыцця, будаўніцтва сацыялізму, дружбу савецкіх народаў, паказваў будні працоўнага чалавека, напружанасць класавай барацьбы, нацыянальна-вызваленчую барацьбу працоўных Заходняй Беларусі. Шмат увагі надаваў праблеме выхавання новага чалавека. Пісаў кнігі для дзяцей. Пераклаў на беларускую мову паэму А.Пушкіна «Руслан і Людміла», асобныя творы Д. Беднага, М. Ісакоўскага, А. Суркова і іншых. Памёр у 1963 годзе.

1991 год — па пастанове прэм'ер-міністра СССР Валянціна Паўлава пачаўся абмен 50- і 100-рублёвых купюр узору 1961 года. Паведамленне аб будучай грашовай рэформе з'явілася ў друку толькі напярэдадні, 21 студзеня. На абмен адводзілася ўсяго тры дні (сталінская грашовая рэформа 1947-га адводзіла на падобную працэдуру тыдзень), усё гэта насіла адкрыта канфіскацыйны характар. Сума абмену не павінна была перавышаць месячнага заробку. У адваротным выпадку трэба было пісаць тлумачальную ў спецыяльную камісію, створаную на кожным прадпрыемстве. Пенсіянеры і непрацуючыя мянялі грошы ў ашчадных касах. У шматгадзінных чэргах людзі гублялі прытомнасць. Новыя, «паўлаўскія» 50- і 100-рублёўкі ўзору 1991 года з'явіліся ў абарачэнні толькі ў пачатку лютага. Паўлаў хацеў нанесці ўдар па ценявым капітале. Але падпольныя мільянеры захоўвалі зберажэнні ў цвёрдай валюце, золаце, і абмен закрануў у першую чаргу старых, а таксама тых, хто гадамі збіраў грошы на «чорны дзень». Аздараўлення фінансаў не адбылося, а Валянцін Паўлаў імгненна зрабіўся самым непапулярным палітыкам у СССР.

1962 год — нарадзіўся Міхаіл Міхайлавіч Захараў, беларускі спартсмен і трэнер (хакей з шайбай), заслужаны трэнер Беларусі, майстар спорту СССР міжнароднага класа. Лепшы хакеіст Беларусі (1990). Лепшы трэнер Беларусі (1994). Падрыхтаваў шэраг спартсменаў высокага класа.

Францыск Скарына (1490-1551), беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар:

«Любіце кнігу, бо яна — крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Дзюймовачка. Тромб. Барс. Карсар. Удача. Акорд. Сага. Гульман. Ангелей. Герб. Кабрыялет. Рака. Ані. Брагін. Граніт. Бэрк. Віні. Хам. Тартак. Астра. Ягня. Гар. Крада. Сотка. Аквапрык.

Па вертыкалі: Прасцюк. Бурацына. Колер. Работар. Кварт. Анод. Арэка. Кампар. Дах. Судак. Гітара. Майор. Пасаг. Акр. Дагестан. Тагер. Ангіна. Адбіт. Клясік.

■ Крымінал

Тры мяшкі з нарказеллем

Больш за 10 кілаграмаў марыхуаны захоўваліся ў трох мяшках, якія знаходзіліся ў скрынях, а тыя, у сваю чаргу, размяшчаліся ў яме і былі засыпаны сенам у адрыне. Усе перасцярогі, якія зрабіў злодзей, яму не дапамаглі. Супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі змесціва хованкі ў адным з сельскіх населеных пунктаў Гомельшчыны. Як паведаміў **начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Гомельскага УУС Юрый МАРКЕВІЧ,** гэта адна з найбуйнейшых партый марыхуаны за апошнія некалькі гадоў. Канфіскацыя расліннай атруты стала магчымай пасля затрымання некалькіх збытчыкаў у Гомелі. У выніку прафесійных аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў праваахоўнікі выйшлі на пастаўшчыка з маланаселенай вёскі чарнобыльскай зоны. Падчас агляду дома і прылеглай тэрыторыі і была выяўлена схованка. Па самых сціплых ацэнках аператыўнікаў, кошт канфіскаваных канопляў на чорным рынку склаў бы больш 100 мільёнаў рублёў. А гэта больш за 40 тысяч доз.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

20 студзеня ў маёй сяброўкі **Тамары Стэфанаўны Чэпікавай** з пас. Крупскі Мінскай вобласці — юбілей! Жадаю сяброўцы моцнага здароўя, радасці. Няхай здзейсняцца ўсе яе мары!

Бачышча Люда.

Віншую з днём нараджэння старэйшага ўнука **Дзмітрыя Лугоўскага.** Ён служыць у арміі другі год. Жадаю яму выдатных паказчыкаў у баявой падрыхтоўцы, сібірскага здароўя, вясёлых сяброў, дабрабыту, клопату блізкіх людзей, а таксама здаровым і дужым вярнуцца дадому.

Бабуля.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.12	17.32	8.20
Віцебск	9.07	17.15	8.08
Магілёў	9.02	17.22	8.20
Гомель	8.52	17.25	8.33
Гродна	9.26	17.48	8.22
Брэст	9.20	17.55	8.35

Месяц

Першая квадра 19 студзеня. Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Піліпа, Пятра, Яўстрата.*
К. *Анастасіі, Вікторыі, Віктара, Вінцэнта, Дамініка, Мацея.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

На працы.

— Чаму ты спазніўся?

— Стукнуўся галавой аб рог падушкі і страціў прытомнасць на дзве гадзіны.

Дурненькая, ну хто табе сказаў, што ты тоўстая?

Давай, бяры два крэслы і сядай да нас.

Трохгадовы Вовачка кліча бацьку:

— Тата, дай мне швабру.

— Навошта?

— Я катка з-пад ложка паклічу!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 25.903. Індэкс 63850. Зак. № 382.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 21 студзеня 2013 года.